Bielarus553C.qxd 2/3/2009 6:27 PM Page 3

Жыве Беларусь!

# БЕЛАРУС

Address: P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

BIELARUS/Belarusan newspaper in Free World ISSN 1054-9455
Published by the Belarusan American Association, Inc.

№ 553 Люты 2009 г.
Год выданьня 58

## ЗША і сьвет

Прачытаўшы ў студзеньскім нумары “Беларуса” артыкул Алесі Сёмухі “Беспрэцэдэнтны выбар будучыні” яшчэ раз пераканаўся ў тым, наколькі шырока распаўсюджаны далёкі ад праўды міт аб тым, што Злучаныя Штаты Амэрыкі моцна сапсавалі свой імідж ў сьвеце, і нават даўнія саюзьнікі адмаўляюцца ад супрацоўніцтва зь імі. Падаецца, што вінаваты ва ўсім, безумоўна, Джордж Буш, і нова-абраны прэзыдэнт Барак Абама стане тым, хто верне краіне ранейшую павагу ў сьвеце. Аб гэтым цьвердзяць і сам Абама, і будучы дзярсакратар Гілары Клінтан, усе дэмакраты і нават некаторыя рэспубліканцы (у тым ліку Джон Макейн падчас выбарчай кампаніі).

Здавалася-б, усе ведаюць, што саюзьнікі адвярнуліся і разьбегліся. Але ці праўда гэта? Давайце паглядзім, пачынаючы з Заходняй Эўропы – таго рэгіёну, пра які думаюць многія, калі кажуць пра “сьвет”. Адносіны Амэрыкі з эўрапейскімі краінамі ніколі не былі аднолькавымі, але сёньня яны ў добрым стане. Калі нехта сумняваецца, то няхай спытае такіх людзей як Браўн, Сарказі, Меркель ці Бэрлусконі. Ня трэба тут нават узгадваць усходне- і цэнтральнаэўрапейскія краіны.

Ёсьць толькі адзін эўрапейскі ўрад, зь якія адносіны апошнім часам складаныя: гэта гішпанскі. Гэта таму, што прэм'ер-міністру Запатэру аж сьвярбіць, каб ўсё зрабіць насуперак Злучаным Штатам. Ягоны папярэднік Азнар быў дзеячам зусім іншага кшталту, і пры ім ніякіх складанасьцяў не было. Можна адміністрацыі Абамы больш пашанцуе ў справах з Запатэрам.

Як гэта ні няёмка чуць абвінаваўцам Дж. Буша, але амэрыканскі імідж у Афрыцы сёньня дастаткова добры, шмат у чым дзякуючы Бушавым праграмам па барацьбе са СНІДам і малярыяй ды й увогуле ягонай увазе да гэтага кантынэнту.

Адносіны з Індыяй найлепшыя за ўсю іх гісторыю. І сам Буш сказаў, што дасягнута гэта было не губляючы амэрыканскага ўплыву ў Пакістане. Адносіны Буша і ЗША з Японіяй, Паўднёвай Карэяй і Кітаем таксама добрыя, ня гледзячы на ўсе супярэчнасьці, якія існуюць паміж гэтымі трыма краінамі. Некаторыя кажуць, што амэрыкана-японскія сувязі ўскладняюцца занадта мяккімі адносінамі ЗША да Паўночнай Карэі. Але большасьць крытыкаў Буша вінавацяць яго зусім ня ў мяккасьці да Паўночнай Карэі ці якой іншай краіны.

Найбольш пакрыўджаныя на Амэрыку хіба кітайскія дэмакратычныя актывісты за тое, што тая слаба прымушае ўлады Кітаю да дэмакратызацыі.

Адносіны з краінамі Лацінскай Амэрыкі таксама добрыя, асабліва з Мэксікай, Калюмбіяй і Бразіліяй. Цікава, ці стануць яны лепшымі пры Абаме, які выказўся супраць дамовы аб свабодным гандлі з Калюмбіяй, і ўлічваючы ягоную схільнасьць да пратэкцыянізму.

Ёсьць лацінамэрыканскія краіны адносіны зь якімі нацягнутыя – асабліва з Вэнісуэляй, Балівіяй і Нікарагуа. Але тут прычына ў антыдэмакратычных асобах, якія кіруюць там. Тое самае тычыцца Кубы, у адносінах да якой Буш фактычна нічога не зрабіў. Але ці хто яго вінавуціць у тым, што ён бязьдзейнічаў у адносінах да камуністычнага рэжыму там?

Блізкі Ўсход займаў найбольш увагі Буша. Ён сьцьвярджае, што дасягнуў неблагіх посьпехаў і там: прасоўваючы рашэньне ізраільска-палестынскай праблемы, Амэрыка абяцала абараняць Ізраіль і ў той самы час захоўвала добрыя адносіны з Саўдаўскай Аравіяй, Ярданам, Эгіптам і ААЭ. Цяпер ЗША маюць саюзьніка ў Іраку. Буш нават зрабіў сваім амаль саюзьнікам Муамара Кадафі ў Лібіі – самы незвычайны выбрык гісторыі. Чуваць былі абвінавачаньні Бушу за нежаданьне ціснуць на такіх саюзьнікаў як Эгіпет і Саудаўскую Аравію, ці на ворагаў, як Сірыя, каб палепшыць іх. Але гэта зусім ня тое, чым на думку некаторых “Буш зруйнаваў адносіны з саюзьнікамі”.

Цікавы выпадак з Расеяй: Буш быў далёкі ад канфрантацыі з Пуціным нават тады, калі Расея пачала ствараць сур'ёзныя праблемы. Ці будуць адносіны з Расеяй лепшыя праз чатыры

*Заканчэньне на бачыне 2*

## Выхад з крызісу



**Зянон ПАЗЬНЯК**

Фінансава-эканамічны крызіс абняў палову сьвету, асабліва захапіў Эўропу і Амэрыку.

У розных краінах ён адбываецца па-рознаму. Усюды цярпяць бізнэс, вытворчасьць, гандаль і банкі. Але, трэба сказаць, простага чалавека ў Заходнім сьвеце крызіс закрануў найменш датклі-ва. Тым часам у нас, на Беларусі, ён стукнуў найбольш па простых людзях, па ўсім народзе. Чаму так адбылося, што робіцца, і што рабіць у гэтым становішчы?

Крызіс высьпяваў даўно і зьвязаны ён з несувымерным павелічэньнем цаны за нафту, якая зьяўляецца адным з базавых чыньнікаў фармаваньня цэнаў на тавары і адыгрывае ў сучасным сьвеце ролю каталізатара сусьветных грошай (даляра). Актыўна спрыяла гэтаму працэсу (палітычным мэтадамі) гэбоўская Расея, эканамічнае існаваньне якой залежыць ад цаны на нафту.

Адначасна з ростам цэнаў на нафту адбывалася штучнае зьніжэньне курсу амэрыканскага даляра з боку Амэрыкі і інтэнсіўнае падвышэньне кошту нерухомасьці. Наступны этап – падвышэньне курсу даляра і зьніжэньне цаны нерухомасьці.

На гэтых кіруемых працэсах нажываюцца краіны-экспарцёры нафты (найбольш Расея) і асаблі-ва (на маніпуляцыях зь нерухомасьцю і курсах) – групы, якія ўплываюць на фармаваньне курсу сусьветнай валюты і цэнаў на нерухомасьць. Летам мінулага году сыстэма дала збой – банкі перааціналі свае магчымасьці: ня вытрымаў амэрыканскі народ, ня змог плаціць па крэдытах (лопнула іпатэка). Пачаўся фінансавы крызіс, дакладную прычыну якога “ня ведаюць” самы стратэгі і аўтары працэсаў. Паказальнае выступленьне (былога ўжо) старшыні Фэдэральнай Рэзэрвавай Сыстэмы ЗША, прызнанага аўтарытэта ў фінансавым сьвеце Алана Грынспэна ў Кангрэсе ЗША ў кастрычніку мінулага году. Ён сказаў, што “памыліўся”, што сорак гадоў усё атрымлівалася, а тут “памыліўся”, і ўсё перакулілася.

Расея, дзе няма нармальнай капіталістычнай эканомікі і нармальнай, адпаведнай банкаўскай сыстэмы, дзе гэбоўская група ўлады пампавала свае нафтадаляры і думала, што так будзе вечна, гэтая Расея адчула крызіс адразу, і адразу ён набыў там пачварныя формы. Усё гэта было цалкам прадказальным, варта было толькі падумаць.

Вялікай небясьпекай і злачынствам перад будучыняй было-б зьвязаць большую палову нацыянальнага гандлю краіны і адзіны імпарт рэсурсаў з такой дзяржавай, як Расея. Але рэжым Лукашэнкі менавіта гэтакае злачынства сьведама і зрабіў. Крызіс у Беларусь прыйшоў найперш з Расеі. Рэжым не рабіў нічога, каб яму запабегчы. Наадварот, гаворачы людзям пра ўяўную стабільнасьць, рыхтуючы вялікую дэвальвацыю, рэжым штучна трымаў заніжаную цану ў беларускіх рублях за даляр у той час як даляр зь лета мінулага году йшоў угару. Гэта, як можна меркаваць, дало магчымасьць атрымаць выгаду тым, хто ведаў пра дэвальвацыю.

Дзейнасьць рэжымнага кіраўніцтва Беларусі ва ўмовах крызісу, які яно наклікала, прадыктаваная выключна і толькі клопатам пра захаваньне сваёй улады, гэтак-жа як і рэакцыя на новыя дачыненьні Ўразьвязу да палітыкі антыбеларускага рэжыму. Нічога ў прынцыпе не зьмянілася і ня будзе зьмяняцца ва ўнутранай палітыцы на Беларусі (акрамя маленькіх і паказушных саступак, якія не зьяўляюцца нават тэндэнцыяй). Зьнішчэньне ўнутранага рынку гэтак-жа, як і зьнішчэньне нацыянальнай беларускай культуры, працягваецца.

Сустрэча зь прэзыдэнтам Ючанкам, якая нядаўна адбылася ў Чарнігаве, і чарговая ўяўная зацікаўленасьць Лукашэнкі праектам Балта-Чарнаморскага калектара (БЧНК), за ажыцьцяўленьне якога ўвесь час змагаўся Народны Фронт, – гэта зноў чарговае гульбішча рэжыму, каб выцыганіць малую цану за газ ад пуцінскай Расеі. Атрымалі цану, і на гэтым цікавасьць да БЧНК скончыцца. БЧНК ніколі ня стане зьместам эканамічнай палітыкі лукашысцкага рэжыму, як ніколі ня стане марыянэтка распараджацца сабой. Асобным эканамічным і палітычным накірункам дзеяньня БЧНК быў толькі ў Народным Фронце. Ажыцьцяўляючы гэтую ідэю, мы добра ўсьведамлялі, каму яна будзе непадабацца. За БНФ і ўкраінскім Рухам стаяць ужо міжнародныя дачыненьні і пагадненьні, распрацоўка праектнай дакумэнтацыі па БЧНК і нават ахвяры (зьнікненьне адказнага па Калектару ад Народнага Руху Ўкраіны Міхайлы Байчышына ў 1993 годзе разам з дакумэнтамі БЧНК). БЧНК не для антыбеларускага рэжыму і не для Лукашэнкі.

Жыцьцё беларусаў за гэтай уладай будзе няўхільна пагаршацца. Рэжым ня здольны вывесьці з крызісу не разбурыўшы грамадзтва і эканоміку, не абрабаваўшы народ і не загнаўшы яго ў галечу (хаця крызіс сам па сабе павінен прыносіць аздараўленьне). Аздараўленчае выйсьце з крызісу можа адбыцца толькі пры адхіленьні гэтага рэжыму ад улады. Аналіз паказвае, што наперадзе – грамадзка-эканамічны стрэс і вельмі цяжкі час, калі толькі ня ўдасца хутка адвязацца ад вялікадзяржаўнага ціску Расеі і пазбавіцца ад кіруючага рэжыму на Беларусі. У крызіснай сытуацыі беларускі народ у прынцыпе мог-бы выжыць сам, калі-б у яго была элемэнтарная свабода дзеяньняў і доступ да сваёй нацыянальнай уласнасьці. Але, зразумела, што яму не дадуць дыхнуць, а будуць толькі душыць (дачыненьні з дробнымі прадпрыймальнікамі – характэрная ілюстрацыя).

Трэба было-б у гэтым становішчы даць людзям волю, каб яны маглі ўнутры краіны рабіць (вырабляць), што хочуць і прадаваць, што хочуць, дзе хочуць і каму хочуць. Патрэбныя на гэтую дзейнасьць і на гэты час спрошчаныя невысокія падаткі. Доступ грамадзянаў Беларусі да зямлі. Заахвочваць прыватныя фермы і хутары. Трэба спрасьціць і аблегчыць грамадзянам выезд на працу (на заробкі) за мяжу. Трэба панізіць мінімум ў дзесяць разоў арэнднную плату за памяшканьні, за рабочыя месцы на рынках, у варштатах і г. д. Трэба ўвогуле скасаваць мафійную манаполію на нерухамасьць, якой незаконна распараджаецца адзін чалавек. Спыніць беспэрспэктыўнае будаўніцтва “аграгарадкоў” і г. д. па ўсёй шкале, з чаго адразу відаць, што пры гэтым рэжыме зрабіць нічога немагчы-

*Заканчэньне на бачыне 6*

Bielarus553C.qxd 2/3/2009 6:28 PM Page 4



# Выстава А. Шатэрніка



Беларускі музэй ў Нью-Ёрку прадставіў 18 студзеня пэрсанальную выставу вядомага беларускага скульптара і мастака Алеся Шатэрніка "Сонцакрыж".

Алесь Шатэрнік вядомы як скульптар і жывапісец, а зараз ён яшчэ піша і вершы. Гэта паказвае, што мастак заўсёды разьвіваецца. Бальшыня выстаўленых твораў – краявіды.

Вялікае эмацыйнае ўзьдзеяньне на прысутных на адкрыцьці зрабіла карціна "Рэчка Цна" (палатно, алей 2006г.). "Сам Боскі дух адлюстраваны ў гэтай працы", – сказаў Зянон Пазьняк, які зрабіў грунтоўны мастацтвазнаўчы аналіз творчасьці мастака. Складаецца ўражаньне, што карціна трохмерная. Уменьне пісаць колерам і сьвятлом паказана ў многіх працах мастака. Прыгожа і тонка выкарыстана сьвятло ў карціне "Лынтупка" (палатно, алей 1998), ад яе вее сьвежасьцю і чысьцінёй.

Зянон Пазьняк выказаў падзяку Алесю Шатэрніку за тое, што ён прынёс частку Беларусі ў будынак Катэдральнага сабору сьвятога Кірылы Тураўскага, дзе праходзіць выстава. Ён спыніў увагу на другой галіне творчасьці мастака – скульптуры. На выставе прадстаўлены новы твор скульптара Алеся Шатэрніка "Тадэвуш Касьцюшка" (каралавы камень, таніроўка 2009 г.) Вобраз знакамітага героя беларускай гісторыі, зроблены скульпарам пад час наведваньня Кій-Уэсту ў Флёрыдзе. Гэта своеасаблівы экспромт у новым для пластыкі матэрыяле...

Алесь Шатэрнік расказаў аб сваёй творчасьці. Ён прэзэнтаваў нядаўна выдадзеную кнігі-альбому "Сонцакрыж" і прачытаў паэму з такой-жа назвай.

***Паводле belmove.org***

# Новае знаёмства

***Зусім нядаўна мне пашанцавала пазнаёміцца зь вельмі цікавым чалавекам, гітарыстам апазыцыйна настроеных беларускіх гуртоў "Дуэндэ" і "Эскалібур" Віталікам Крэмезам. Ён зусім нядаўна прыехаў у Амэрыку і расказаў пра яго творчасьць і праблемы, зьвязаныя зь ёй.***



**– Калі ты пачаў займацца музыкай?**

Я цікавіўся музыкай з 8 клясы школы, але-ж пачаў сур'ёзна займацца ва ўнівэрсітэце з адным з лепшых гітарыстаў Беларусі, які таксама граў у сымфанічным аркестры Міхаіла Фінбэрга.

**– Як доўга ты зьяўляесься сябрам "Дуэндэ" і "Эскалібур"?**

Ад пачатку існаваньня гуртоў: 2 гады і 1 год адпаведна.

**– А дзе вы выступалі?**

У Беларускім Дзяржаўным Эканамічным Унівэрсытэце, у клюбах, на карпаратыўных імпрэзах. Аднойчы выступалі у Беларускай дзяржаўнай філярмоніі.

**– Ты называеш свае гурты апазыцыйнымі. Чаму?**

Таму што мы сьпявалі пра тое, пра што забаронена сьпяваць. Музыка для мяне – гэта парыў душы, таму мы і сьпявалі пра свабоду, супраціўленьне існуючаму рэжыму, вечнасьць існаваньня.

**– І што вам так лёгка ўдавалася сьпяваць пра свабоду ў Беларусі?**

Не, ніколі нам не дазвалялі гэтага. Арганізатары і дэканат неаднаразова зьмянялі тэксты. У апошні раз наш дэкан забараніў песьню "Наша краіна зьнікла даўно" з-за апазыцыйнага зместу. Сказаў, што калі мы хочам выступаць, словы павінны зьмяніць. У песьні гаворыцца аб тым, што народ прачнуўся, паглядзеў на сьвет, убачыў, што ёсьць тут і добрае, і дрэннае, і зразумеў, у якім напрамку трэба ісьці.

**– А чым ты яшчэ займаўся?**

Я дапамагаў арганізоўваць канцэрты іншых апазыцыйных выканаўцаў, неаднаразова даводзілася сутыкацца з рознымі праблемамі зь міліцыяй, калі без прычыны адключалі электрычнасьць разганялі гледачоў. Усе ведалі, канешне, што не было ніякіх праблемаў з электрычнасьцю, гэта нашыя песьні пра свабоду палохалі міліцыю.

**– Ці плянуеш ты працягваць сваю апазыцыйную дзейнасьць у Амэрыцы?**

Канешне! Мне-б хацелася, каб амэрыканцы даведаліся што такое беларускі рок, культура і мова. Тут я змагу сябе праявіць не хвалюючыся, што магуць арыштаваць за мае думкі.

***Гутарыла Хрысьціна ШКУРАТАВА***

# Лісты ў рэдакцыю

## Як Беларусі стаць свабоднай?

Многія лічаць, што каб Беларусь стала свабоднай, народ павінен выйсьці на плошчы па усёй краіне. Але ніхто не тлумачыць, як гэтага дасягнуць. Што можа вывесьці народ на "барыкады"? Магчыма, гэта здарыцца пасьля нейкая падзеі, якая выкліча эфэкт "лавіны", калі адно дзеяньне цягне непрадказальныя наступствы.

Прыкладаў гэтага ў гісторыі ёсьць шмат. Так, у ЗША аднойчы падлеткі закідалі сьнежкамі ангельскіх вайскоўцаў, на што тыя адказалі агнём. У выніку народнае абурэньне вылілася ў рэвалюцыю. Ці вядомы прыклад з гісторыі Расейскай імпэрыі, калі мірнае шэсьце людзей, якія накіроўваліся да "добрага цара" ("ад якога чыноўнікі хаваюць праўду"), было расстраляна. Вынікам стала першая расейская рэвалюцыя.

Беларусь, на мой погляд, блізкая да гэтага стану, бо на мітынгах АМАП брутальна зьбівае старых і маладых, калечачы ім жыцьці. І калі "праваахоўныя органы" заб'юць якога-небудзь чалавека: напрыклад, падлетка, які расьпісваў апазыцыйнымі лёзунгімі будынкі (а яны блізкія да гэтага, бо могуць зьбіць толькі за нашэньне бел-чырвона-белага значка ў цэнтры сталіцы), то пачнецца ланцуговая рэакцыя (хоць улады і зробяць усё магчымае, каб схаваць праўду). Вестка аб здарэньні перадасца ад аднаго да другога па ўсёй Беларусі і ўміг разьвее міт аб добрым "бацьку", народ ня зможа гэтага прабачыць і стрымаць гнеў, і выйдзе на плошчы "з патэльнямі і венікамі". І нішто тады ня зможа спыніць канца "апошняга дыктатара Эўропы".

***Сяргей ШЫРОКІ***

## Інтэрвію Аляксандра Лукашэнкі

Аляксандар Лукашэнка 18 сьнежня 2008 году даў інтэрвію афіцыйным СМІ. І як заўсёды не абыйшлося без абвінавачваньня Эўропы і ЗША. Больш за ўсё мяне шакавала ягоная заява аб тым, што ЗША перасылае грошы беларускай апазыцыі на "экстрэмісцкія мэты". "Навошта нам такія амбасады?" – пытаецца ён. Тым ня менш праз хвіліну кажа, што зьвяртаецца па дапамогу да той-жа амбасады, каб ЗША далі яму пазыку. Ён ня проста возьме грошы, але і абяцае выплаціць у будучыні. Але-ж усім зразумела, што выплачваць ён нічога не зьбіраецца.

Як-жа Лукашэнка пляпуе выкарыстоўваць гэтыя грошы? Пасадзіць яшчэ пару дзясяткаў маладых апазыцыянэраў? Адбудуе яшчэ адну бібліятэку ці дварэц спорту, а тым часам ня будзе прызнаваць, што ў Беларусі крызіс?

Ня цяжка яшчэ некалькі варыянтаў падлічыць. Але-ж я ўпэўненая, што грошы тыя, што ён просіць у ЗША, ніколі ня дойдуць да народу.

Казаў, што хоча праводзіць лібералізацыю дзяржавы, але-ж што мы бачым: апазыцыйных дзеячоў як перасьледавалі, так і перасьледуюць. Нядаўна Алеся Ладуцьку арыштавалі за расклейку налепак з сымболікай Эўразьвязу. У беларускіх прадпрымальнікаў забіраюць грошы: "трэба дзяліцца, дзяліцца цывілізавана", а "хто не адгукнецца, то мы некалькі разоў папросім".

Ну пра якую дэмакратыю тут мы гаворым? Не было яе і ня будзе, пакуль кіруе Лукашэнка.

***Хрысціна ШКУРАТАВА***

***Заканчэньне з бачыны 1***

гады? Сумніўна. Хіба што Абама прыбярэ амэрыканскую ракетную заслону з Чэхіі і Польшчы ды ўвогуле перастане зьвяртаць увагу на правакацыі Расеі. Буш заклікаў прыняць Украіну і Грузію ў НАТА, у той час калі старыя эўрапейскія саюзьнікі ЗША адмовіліся ад гэтага. Дык хто больш схільны да супрацоўніцтва, калі ня Буш?

У выпадку з Іранам дык зусім цяжка вызначыцца. Нехта абвінавачвае Буша ў тым, што ён ня ціснуў на іранскі рэжым, іншыя кажуць, што ён быў надта жорсткі і патрабавальны да яго. У сапраўднасьці-ж Буш дазволіў эўрапейцам весьці з Ірандам бясконцыя перамовы без усялякага выніку. Здаецца, асоба Буша здольная выклікаць самыя супрацьлеглыя абвінавачаньні.

Нарэшце, Аўстралія, Канада, Турцыя, Ізраіль – адносіны з усімі добрыя. Някепска было-б каб тыя, хто хоча паляпшаць адносіны да Амэрыкі ў сьвеце, удакладнілі з кім менавіта іх трэба палепшыць.

Прааналізаваўшы, відаць, што амэрыканскія саюзьнікі адносяцца да краіны папранейшаму добра. І справа, выглядае, толькі ў тым, што глябальныя эліты, у тым ліку эліта амэрыканская, ненавідзяць як самаго Буша і кансэрватараў, так і ўсіх, хто схіляецца да амэрыканскай палітыкі.

Няма неабходнасьці казаць, што Буш рабіў і памылкі. Але ці ў кажным канфлікце паміж Амэрыкай і саюзьнікамі ці іншай дзяржавай была вінаватая толькі Амэрыка? Ці можа ЗША ўжо больш не падпадае, як і ўсе іншыя краіны, пад цьверджаньне, што дзяржавы ня маюць сталых саюзьнікаў, а маюць толькі сталыя інтарэсы?

Буша асабліва ня любяць у "Guardian", «Le Mond», "Der Spigiel". Але калі прэзыдэнт Абама пачне рабіць захады па абароне амэрыканскіх інтарэсаў, ці будзе ён такім дарагім і жаданым сярод гэтых дэмагогаў? Пачуцьці да Амэрыкі заўсёды былі зьменанымі, і ня Буш у гэтым вінаваты.

Сам прэзыдэнт Буш некалі сказаў, абмяркоўваючы сваю папулярнасьць: "Я аддаю перавагу таму, каб мяне паважалі, а не любілі". Ён тады сказаў, што мог-бы стаць на нейкі кароткі час папулярнейшым на Блізкім Усходзе, калі-б, напрыклад, ва ўсіх праблемах вінаваціў Ізраіль. У Эўропе можна было-б набыць папулярнасьць згадзіўшыся, прыкладам, далучыцца да Міжнароднага Крымінальнага Суду ці сказаўшы, што Кіёцкі пратакол – гэта шлях, якім трэба ісьці, змагаючыся з праблемамі акружаючага асяродзьдзя. Але зрабіўшы такія заявы, ён зрабіў-бы памылку, бо чалавек заслугоўвае павагу людзей не заявамі, а тым наборам каштоўнасцяў, якімі кіруецца ў сваім жыцьці, і тым, як ён іх адстойвае.

І ў заключэньне яшчэ некалькі словаў Джорджа Буша, якія ён сказаў пра сваю краіну: "Нас паважаюць, нашыя каштоўнасьці цэняць, і чэргі, каб трапіць у Амэрыку, застаюцца доўгімі."

***М. КЛАКОЦКІ***

Bielarus553C.qxd 2/3/2009 6:29 PM Page 5



# Беларусь за месяц

## Дэвальвацыя рубля

1 студзеня Нацбанк Беларусі правёў дэвальвацыю айчыннага рубля. Афіцыйны курс беларускай валюты за адзін дзень быў паніжаны на 20,45%.

Такім чынам на 2 студзеня курс даляра ўстанаўліваўся ў памеры 2 650 рублёў, эўра – 3 703 рублі, расейскага рубля – 90 рублёў 16 капеек. Што праўда, за наступныя тры тыдні курс даляра вырас на 45 рублёў, двух другіх валют, наадварот, зьнізіўся – эўра на 240 рублёў, расейскага – на 10 рублёў.

Дэвальвацыя рубля на 20% была таксама адной з умоваў крэдыту ў 2,48 млрд даляраў, атрыманага ад Міжнароднага валютнага фонду. Першы транш крэдыту ў 788 млн даляраў ужо паступіў.

Што праўда, улады павялі сябе не найлепшым чынам у гэтай сытуацыі ў вачох насельніцтва. Лістапад і сьнежань яны пераконвалі, што дэвальвацыя 20% недапушчальная, што максімум, на што адважацца, будзе 10%. Лукашэнка таксама неаднаразова казаў, што паніжэньня курсу рубля ён не дапусьціць.

## Спажывецкая ліхаманка

Казаць пра тое, што дэвальвацыя шакавала насельніцтва, не сказаць нічога. Перад Новым годам, з увагі на будучыя сьвяты, людзі актыўна скідалі валюту. Але ўжо з 2 студзеня ўсе пачалі яе купляць нават паводле новага курсу, што выклікала велізарны попыт і чэргі. Першы тыдзень новага году ў Менску, каб набыць $200 часам трэба было патраціць палову дня і абыйсьці зь дзясятак абменьнікаў.

Першыя дні людзі таксама актыўна кінуліся купляць бытавую тэхніку, якая яшчэ прадавалася па старых коштах, а таксама дываны, бялізну, нават настольныя лямпы і прадметы гігіены. Некаторыя крамы былі вымецены, як кажуць, пад чыстую.

Ажыятаж пайшоў на спад пасьля праваслаўнага Раства. Зрэшты, многія тавары паступілі ў крамы ўжо па новых коштах. Прадукты, лекі падаражалі нават не на 20, а на ўсе 30—40%.

Апроч таго, першыя два тыдні пасьля Новага году ў Беларусі актыўна цыркулявалі чуткі пра яшчэ адну дэвальвацыю рубля, а таксама дэнамінацыю (зьмяншэньне нулёў на купюрах) або пераход на расейскі рубель. Нацыянальны банк кожны дзень сваімі прэс-рэлізамі гэтыя чуткі абвяргаў. А што рабіць, калі табе ўжо ня вераць?

## Вырасьлі адсоткі

Дэвальвацыя рубля і павышэнне коштаў таксама прывялі да чарговага павышэньня Нацбанкам стаўкі рэфінансаваньня, з 12% да 14% гадавых. Такім чынам вырасьлі стаўкі банкаў па крэдытах. Фармуючы велічыню стаўкі, камэрцыйныя банкі дадаюць да фіксаванай стаўкі рэфінансаваньня свае адсоткі (ад 8 да 12). Крэдыты на аўтамабілі і спажывецкія патрэбы цяпер наогул фантастычныя да 25-27% гадавых. Гэта азначае, што ўзяўшы крэдыт на аўтамабіль на пяць гадоў памерам 5 тыс. даляраў, за яго потым выкладзеш больш за 10 тыс. На фоне адсоткаў па крэдытах у ЗША і краінах Эўропы, становішча беларускіх спажыўцоў не зайздроснае. Крэдыты на пабудову кватэры вырасьлі да 20-25% гадавых – але большасьць банкаў адмаўляецца цяпер крэдытаваць жыльлё і засяродзіліся на спажывецкіх крэдытах, стаўка па якіх наогул нерэальная: ад 40 да 50%.

Зь іншага боку, банкі, каб не дапусьціць адтоку сродкаў, павышаюць адсоткі па ўкладах. Але той, хто меў уклады ў беларускіх рублях, 2 студзеня прачнуўся зьбяднелым на 20%. І цяпер на тых, хто адкрывае рахунак у беларускіх рублях, глядзяць як на вар'ята.

## Крэдытаў больш ня будзе

Расея нават не разглядае просьбу Беларусі аб выдзяленьні крэдыту ў 100 мільярдаў расейскіх рублёў (3 млрд даляраў) у абмен на пераход на разьлікі ў рублях ва ўзаемнай гандлі. Пра гэта заявіў намесьнік міністра фінансаў Расейскай Фэдэрацыі Панкін. Аб выдзяленьні новага крэдыту, у дадатак да ранейшага расейскага ў 2 мільярды даляраў, неаднаразова казаў Лукашэнка. Праўда, дадатковы крэдыт у 500 млн даляраў выдзеліла Вэнэсуэля.

## Баршчэўскі сыходзіць



Лявон Баршчэўскі зьбіраецца сысьці з пасады кіраўніка Партыі БНФ. Зробіць ён гэта да пачатку правядзеньня партыйных сходаў па вылучэньні кандыдата ў прэзыдэнты Беларусі. Рашэньне прынятае, каб удзельнічаць у "вылучэньні партыйнага кандыдата ў прэзыдэнты на роўных умовах зь іншымі прэтэндэнтамі». Партыйныя сходы запланаваныя ў БНФ на вясну.

Відаць, дэмакратычная апазыцыя выставіць некалькі кандыдатаў. Ужо заявілі пра меркаваны ўдзел у выбарах экс-кандыдат на выбарах 2006 г. Аляксандар Мілінкевіч, былы намесьнік старшыні Партыі БНФ Алесь Міхалевіч. Ад левых будзе балятавацца Сяргей Калякін і прадстаўнік сацыял-дэмакратаў.

Прэзыдэнцкія выбары павінны прайсьці не пазьней за 8 лютага 2011 году, але не раней за 8 сьнежня 2010 году.

## Лукашэнку запрасілі на саміт у Прагу

Інфармацыя не пацьверджаная, але вельмі верагодная. Ініцыятарам запросінаў выступіла Чэхія, якая старшынюе цяпер ў Эўразьвязе. Беларускі кіраўнік ужо амаль дзесяць гадоў нікуды не выяжджаў. І санкцыі дзейнічалі, і не запрашалі.

## Лібэралізацыя бізнэсу

Зь 1 лютага ўводзіцца заяўны прынцып дзяржаўнай рэгістрацыі ўсіх суб'ектаў гаспадараньня, за выняткам банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых установаў (напрыклад, ламбардаў). Адпаведны дэкрэт № 1 падпісаў 16 студзеня Лукашэнка. Рэгістрацыя цяпер будзе ажыццяўляцца адразу ў дзень падачы неабходных для яе ажыцьцяўленьня дакумэнтаў. Для рэгістрацыі юрыдычнай асобы патрэбныя: заява, статут і дакумэнт, які пацьвярджае выплату дзяржаўнага падатку. Для рэгістрацыі індывідуальнага прадпрымальніка — заява, фатаграфія і дакумэнт аб выплаце дзяржаўнага падатку. Пры прадстаўленьні неабходнага пакету дакумэнтаў адмова ў дзяржаўнай рэгістрацыі не дапускаецца.

Зроблена рэч, якую трэба было зрабіць 14 гадоў таму. Але з другой паловы 1990-х прадпрымальнікаў душылі як "вашывых блохаў".

## Газ па 148 даляраў

Такім будзе сярэдні кошт газу для Беларусі ў 2009 годзе, заявіў на прэс-канфэрэнцыі намесьнік старшыні Савету міністраў Андрэй Кабякоў. Пытаньне кошту на газ цікавіла многіх з 22 сьнежня, калі сустрэліся ў Маскве прэзыдэнты Беларусі і Расеі Лукашэнка і Мядзьведзеў. Пра выніку сустрэчы інфармацыі было мала. Вось і выказваліся розныя здагадкі. Зрэшты экспэрты памыліліся зусім крыху. Яны казалі пра цану ў 140 даляраў.

## Вызначыліся



На конкурс "Эўрабачаньня" ад Беларусі едзе сьпявак Пётра Ялфімаў. Гэта высьветлілася ў выніку тэлефоннага галасаваньня гледачоў пасьля фіналу беларускага конкурсу. Пётра Ялфімаў – уладальнік выдатнага голасу, нават сьпяваў у свой час у "Беларускіх песьнярах".

Летась беларусаў на конкурсе прадстаўляў Руслан Аляхно, які заняў перадапошняе месца ў сваім паўфінале.

## Пра футбол

Студзень запомніўся найперш гучнымі пераходамі беларускіх гульцоў. Лідэры чэмпіёна Беларусі барысаўскага БАТЭ Віталь Радзівонаў і Генадзь Блізьнюк абралі другую нямецкую бундэслігу. Радзівонаў будзе выступаць за "Фрайбург", а Блізьнюк – за "Франкфурт".

Форвард зборнай Беларусі Віталь Кутузаў таксама зьмяніў клюб. Ён застаўся ў Італіі, але будзе гуляць за "Бары", каманды Сэрыі Б, якая вядзе барацьбу за пуцёўку з элітны дывізіён.

*Уласны карэспандэнт*

## Пераезд "Рок-Каранацыі"

Арганізатары вырашылі перанесьці месца дзеі з сталіцы ў ...Маладэчна. Упершыню за 14--гадовую гісторыю цырымоніі.

Заснавальнік і прадусар "Рок--Каранацыі" Юры Цыбін кажа, што надта закарцела выйсьці за звыклыя межы ранейшых цырымоніяў. У тым ліку і геаграфічна. Таму "Каранацыя" часова пераедзе ў Маладэчна і пройдзе ў мясцовым Палацы культуры 14 сакавіка. Да ўсяго ўдзел у ёй возьме заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь сымфанічны аркестар музычнай вучэльні Маладэчна. У аркестровым суправаджэньні і выступяць вядучыя рок-каманды краіны.

Ужо далі папярэднюю згоду гурты "Ляпіс Трубяцкой", этна-трыё "Троіца", IQ48, "Дзетідзетей", "Стокс", а таксама гурты з рэгіёнаў — "Авангардшкола" (Магілёў), "Садъ" (Берасьце), "Князь Вітаўт" (Полацак). Мяркуецца, што выступіць і Лявон Вольскі. Адкрые цырымонію выступ уладальнікаў галоўнай Рок-Кароны-2007 Neuro Dubel.

Выступоўцы сыграюць па дзьве песьні — адну зь іх з аркестрам.

Сёлета "Рок-Каранацыя" апошні раз пройдзе пад гэтай назвай. Налета ад слова "рок" у назьве вырашана адмовіцца.

*Наша Ніва*

# Калядны рэйд ТБШ

Упярэдадні калядных сьвяткаваньняў прадстаўнікі Таварыства беларускай школы ладзілі гасьцявыя рэйды ў менскія школы і садкі, у якіх навучаньне і выхаваньне вядзецца па-беларуску. Напярэдадні Новага году такія візыты ўжо былі зьдзейсненыя ў СШ № 60, гімназіі № 14 і 23. Асноўная мэта іх – калядныя віншаваньні і ганараваньне дыплёмамі ТБШ "За прафэсійнае майстэрства і выхаваньне нацыянальнай сьвядомасьці будучых актыўных грамадзян незалежнай Беларусі" лепшых пэдагогаў, якія выкладаюць па-беларуску, уручэньне невялікіх падарункаў навучальным установам і настаўнікам.

Да фармаваньня падарункаў далучыліся шматлікія грамадзкія арганізацыі. "Цэнтар Супольнасьць" падараваў школам розныя мэтадычныя дапаможнікі, літаратуру па грамадзянскай адукацыі, а таксама запісаў адмысловы DVD дыск "Гадуем беларусаў", у які ўвайшлі сцэнары дзіцячых сьвятаў, гульні, мэтадычныя матэрыялы па краязнаўству і этнашколе, песенькі для маленькіх, аўдыёкнігі, казкі, чытанкі, мультфільмы, мастацкія фільмы і шмат чаго карыснага для настаўніцкай працы. Грамадзкае аб'яднаньне "Згуртаваньне беларусаў сьвету "Бацькаўшчына" прэзэнтавала настаўнікам гістарычныя кнігі, Аб'яднаньне бацькоў зь Беласточчыны "АБ-БА" падаравала кожнай школе беларускую абэцэду – каляровы набор літараў, які стварыла выдатная беларуская настаўніца зь Беластоку Аліна Ваўранюк. Беларуская школка ў Нью-Ёрку пад кіраўніцтвам Галіны Падлескай і культурна-адукацыйная фундацыя Орса-Романо дапамаглі сфармаваць для кожнага беларускага садочка вялікія наборы дыскаў і касэтаў з мультфільмамі, казкамі, песенькамі, а настаўнікам яны падаравалі кнігі беларускіх клясыкаў: Янкі Купалы, Васіля Быкава, Ніла Гілевіча і іншых. А кампанія "Будзьма!" дапамагла аздобіць падарункі адмысловымі торбачкамі, віншавальнымі паштоўкамі. Ад імя ТБШ пэдагогаў віншавалі Алесь Лозка, старшыня, і Тамара Мацкевіч, намесьніца старшыні грамадзкага аб'яднаньня.

На фоне шматлікіх перадкалядных турботаў, а таксама бясконцых рэформаў, праверак, бюракратычных патрабаваньняў, школьныя і дашкольныя установы з задавальненьнем віталі гасьцей з падарункамі і віншаваньнямі.

У сярэдняй школе г. Менску № 60, адзінай, дзе арганізавана навучаньне па-беларуску ва ўсіх клясах, гасьцей весяліў традыцыйнымі песьнямі калядны гурт школьнікаў з "зоркай" і "казой". Падарункі і дыплёмы ТБШ атрымалі настаўнікі гісторыі Людміла Крыловіч і Аксана Хахлова, якія шмат увагі надаюць краязнаўчай працы.

Плённая размова адбылася ў сталічнай гімназіі № 14, дзе сёлета ў чатырох першых беларускіх клясах навучаецца 84 вучні (падобны вялікі набор адбыўся яшчэ толькі ў 4-й гімназіі). Дарэчы, ў гімназіі № 14 працуе знакамітая настаўніца хіміі Тэрэса Іванаўна Мятліцкая, якая сёлета стала пераможцай конкурсу прафэсійнага майстэрства "Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі" ў намінацыі "Настаўнік". Дырэктар Сьвятлана Босая распавяла пра іншыя посьпехі гімназіі. Ганараваньні ад ТБШ атрымалі Марыя Гарохава, намесьнік дырэктара; Дзьмітры Ровенскі, кіраўнік узорнага фальклёрнага ансамблю "Дударыкі"; Сьвятлана Собаль, загадчыца бібліятэкі; Натальля Шурдзякова, кіраўнічка мэтадычнага аб'яднаньня настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры.

У гімназіі № 23, якая разьмясьцілася на праспэкце Незалежнасьці, былі ганараваныя разам з дырэктарам Нінай Нікіцінай у асноўным выкладчыкі, якія

*Заканчэньне на бачыне 7*

Bielarus553C.qxd 2/3/2009 6:29 PM Page 6



# “Няскоранасьць”

## Галівудзкі фільм пра Другую сусьветную вайну ў Беларусі




***DEFIANCE** — film by Paramaunt Vintage. Directed by Edward Zwick. With Daniel Craig, Liev Schreiber, Jamie Bell. Opened Dec. 31, 2008.*

31 сьнежня на экраны выйшаў фільм рэжысэра Эдварда Цьвіка “Няскоранасьць” (Defiance) з удзелам сучасных актораў першае клясы —Дэніэла Крэйга, Ліва Шрайбэра і Джэймі Бэла. Гэта бадай першы фільм асноўнай галівудзкай кампаніі (Парамаўнт), дзе месцам дзеяньня зьяўляецца Беларусь (Наваградчына), а здымкі таксама праводзіліся на беларускіх этнічных землях (Віленшчына). Героямі фільму, аднак, зьяўляюцца не беларусы. Сюжэт яго збольшага пабудаваны на аднайменнай кнізе дасьледчыцы Нэхамы Тэц пра чатырох братоў Бельскіх, гэбраяў з Станкевічаў пад Наваградкам, што ў 1942 годзе сталі хавацца ў лесе і стварылі групу, якая складалася з гэбраяў-уцекачоў з гетаў у навакольных мястэчках. Гэтая група пертварылася ў савецкі партызанскі атрад, які базаваўся ў Налібоцкай пушчы і ўдзельнічаў у баявых дзеяньнях супраць немцаў і калябарантаў і ў канцы вайны налічваў каля 1200 чалавек.

Варта адзначыць, што калі гэбраі-партызаны зьяўляюцца героямі фільму, дык беларусы – сяляне і калябаранты – ёсьць ягонымі антыгероямі. Цяжка патрабаваць ад амэрыканскага рэжысэра і галівудзкай кінакампаніі адпаведнага і гістарычна дакладнага адлюстраваньня падзеяў 65-гадовай даўніны ў малавядомай краіне за акіянам. Аднак неабходна адзначыць, што рэаліі Другой сусьветнай вайны і Галакосту ў Беларусі былі больш нюансаваныя і складаныя, чым чорна-белае супрацьстаяньне гэбрайскіх партызанаў усім астатнім, адкрыта варожым (мясцовыя сяляне, немцы і “паліцаі”) і пераважна падступным (савецкія партызаны) сілам. Дарэчы, у фільм не ўвайшла дзейнасьць польскай Арміі Краёвай, што было істотным чыньнікам развіцьця падзеяў у той час.

Фільм пачынаецца з тытраў, сярод якіх такі: сапраўдная гісторыя. Затым апавядаецца пра 50 тыс. гэбраяў, забітых у Беларусі ў першыя дні вайны, і што 1 мільён застаўся чакаць сваго лёсу. Гэтыя лічбы не зусім у парадку, бо па зьвестках навукоўцаў, у тым ліку Цэнтру досьледаў усходне-эўрапейскага гэбрайства пры Гэбрайскім унівэрсітэце ў Ерусаліме, колькасьць ахвяраў Галакосту, улучна з дэпартаванымі з Заходняй Эропы, складае каля 800 тыс. чалавек. Далей пытаньні выклікаюць тытры геаграфічных назваў, якія падаюцца ў польскай мове — верагодна з-за кнігі Н.Тэц, дзе яны таксама па-польску. Але гэта ўносіць блытаніну для гледача, якому, да таго-ж, даводзіцца чытаць такія кароткія рэцэнзіі: “Тры браты-гэбраі ўцякаюць з акупаванай нацыстамі Польшчы ў беларускія лясы, дзе яны далучаюцца да расейскіх байцоў супраціву і ствараюць вёску ў пушчы”. Акрамя “акупаванай Польшчы”, што апынулася сярод беларускіх лясоў, у фільме сустракаецца шмат іншых гістарычных ды прадукцыйных хібаў. Усе пэрсанажы фільму гавораць па-ангельску з моцным акцэнтам, і большасьць рэплік па-расейску — таксама з акцэнтам (летувіскім, бо здымалі ў Летуве). Відаць, акцэнт і моўная блытаніна пакліканыя стварыць у амэрыканскага гледача ўражаньне “кантынэнтальнай экзотыкі”. Аднак аўтару гэтых радкоў, як гледачу, які нагледзеўся больш чым дастаткова фільмаў пра савецкую партызантку, гэта толькі замінае. Большасьць тытраў-перакладаў, якія суправаджаюць рэплікі па-расейску, неадэкватныя. Вось тыповы прыклад: “Немцы плоцяць 500 рублёў за кожнага гэбрая” — на рэпліку: “Немцы за іх на год вызваляюць ад падаткаў”.

Гістарычна неадпаведнае — неабмежаванае ўжываньне алькаголю героямі фільму. Бутэлькі ў іхных руках зьяўляюцца ці не часьцей за зброю, гарэлка п’ецца з рыльца і без закускі — як у тутэйшых барах. На самой справе алькаголь быў тады такім-жа дэфіцытным і стратэгічна важным рэчывам, як соль або выбухоўка, і ніхто, тым больш партызаны, ня сталі-б марнаваць яго.

Неапраўданае ў фільме таксама надужываньне расейскіх мацюкоў, галівудзкага стылю страляніны, калі немцы валяцца долу як гнілыя ігрушы, з аднаго стрэлу. Фантастычнымі падаюцца сцэны начнога бою на дарозе, калі немцы сьвецяць пражэктарам, або сцэна зьнішчэньня нямецкага танку. Але тут у гульню ўступаюць законы жанру, нічога не паробіш. Эпізоды скрозь толькі схематычна накрэсьліваюць характары галоўных герояў, тут таксама зразумела, што эпічную трохгадовую дзею ня ўціснуць у дзьве гадзіны фільму.

Галоўнай хібай ёсьць неапраўданае выстаўленьне беларусаў як “благіх фацэтаў” (bad guys), кульмінацыяй тут робіцца эмацыйны выкрык аднаго з галоўных герояў: “беларускія сьвіньні!” падчас бою ў лесе. Сцэны з удзелам беларускай паліцыі пакідаюць у неінфармаванага гледача ўражаньне, што менавіта яна несла адказнасьць за вынішчэньне гэбраяў, што не адпавядае рэчаіснасьці.

Пры ўсіх сур’ёзных хібах гэтая стужка падымае важныя пытаньні невядомых і маладасьледаваных эпізодаў Другой сусьветнай вайны. Гісторыя вайны ў Беларусі — поўная такіх “белых плямаў”, нягледзячы на тамы савецкіх дасьледваньняў і кілямэтры мастацкіх кінастужак.

Асноўныя групы гістарычных кантравэрсіяў, да якіх зьвяртаецца фільм — гэта пытаньні няпростага маральнага выбару (забойства сям’і паліцаяў, лінчаваньне эсэсаўца, стрэлы ў патыліцу палонным немцам з вэрмахту), пасыўнасьць пераважнай большасьці гэбрайскага насельніцтва (сцэны ў лесе і ў геце Баранавічаў), адносіны з навакольным насельніцтвам і савецкімі партызанамі, рэквізыцыі, праблемы міжполавых адносінаў сярод партызанаў, праблемы адносінаў “байцы — цывільныя ўтрыманцы” ў атрадзе ды іншае. Гэтыя каніравэрсіі ніколі амаль не закраналіся ў савецкіх фільмах, і гэта асноўнае, чым амэрыканскі фільм ад іх адрозьніваецца. Аднак да ўзроўню найбольш аб’ектыўнага і найменш заідэалягізаванага фільму савецкага часу на тэму партызанкі “Ідзі й глядзі”, зьнятага па сцэнары Алеся Адамовіча рэжысэрам Элемам Клімавам, фільму “Няскоранасьць” усё-ж досыць далёка.

***Віталь ЗАЙКА***

# Шчыры вечар ці прыгоды сяброў ЗБМА

Маладзёвая арганізацыя Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня – ЗБМА (Моладзь БАЗА) – суполка, якая заахвочвае розныя віды дзейнасьці. Разам з правядзеньнем мітынгаў, арганізацыяй культурніцкіх імпрэзаў ды дапамозе змагарам за незалежнасць Беларусі, ЗБМА ў авангардзе актыўнага, а часам экстрымальнага баўленьня часу. Сюды можна аднесьці спуск па горнай рацэ, скокі з парашутамі ці стрэльбу ў тыры. Некалькі месяцаў таму суполка распачала новую ініцыятыву – сустрэчы беларускай моладзі ў нефармальных умовах за келіхам добрага напою. Вось што распавёў пра адну з такіх восеньскіх сустрэч, якая скончылася на дзіва незвычайна, яе ўдзельнік.

---

– Па ўсталяванай ужо традыцыі, сабраліся ў суботу вечарам у адным з бараў Нью-Ёрку. Было чалавек шэсьць-восем. Хтосьці прыходзіў, хтосьці сыходзіў.

**– Аб чым размаўлялі?**

– Натуральна, гутарылі на розныя тэмы. Пра жыцьце ў Амэрыцы, пра вучобу, працу. Не абайшлі ўвагай і ўласна беларускія пытаньні. Закраналі праблемы нацыянальнай сьвядомасьці, выкарыстаньня роднай мовы, дзейнаці беларускіх арганізацыяў у ЗША. Па некаторых з гэтых пытаньняў разгараліся гарачыя спрэчкі, бо, зразумела, усе людзі розныя, кожны мае сваё гледжаньне, сваю пазыцыю.

**– Што выклікала самую вялікую дыскусыю?**

– Пра мову доўга спрачаліся. Не сакрэт, што шмат хто з маладых беларусаў ужывае для камунікацыі расейскую мову. Доўгія гады расейскай імпэрскай ды камуністычнай русіфікацыі зрабілі сваю справу. Бальшыня з нас мае расейскамоўных бацькоў і вучылася не па-беларуску ў школе. І гэта вялікая праблема, як зрабіць так, каб моладзь пачала выкарыстоўваць родную мову ў штодзённым ужытку. Прычым, гэтая праблема існуе і ў Беларусі, і тут, у Амэрыцы. Напрыклад, у Нью-Ёрку вялікая расейскамоўная грамада, якая часта паглынае беларускія пачаткі. Сустрэчы ЗБМА тым і карысныя, што мы тут стараемся ўжываць родную мову.

**– Зразумела. Што было далей?**

– Некаторыя з нашай капаніі разыйшліся, засталіся мы ўтрох – я, дзяўчына ды хлопец. Вырашылі працягнуць беларускі вечар, бо было весела і дахаты не хацелася. Пайшлі ў начны клюб, каб патанчыць, так-бы мовіць, паказаць як мы адпачываем. Здаецца, амэрыканцы ня могуць так весяліцца як мы – шчыра, адкрыта. Неяк усё ў іх праходзіць па пляну, усё быццам-бы прадвырашана. Гэта тычыцца і аднаго канкрэтнага вечара ды і ўсяго жыцьця. З другога боку, беларусы, нават калі даўно жывуць у Штатах, – трошкі іншыя, як я кажу, шчырэйшыя ў пачуцьцях ды дзеяньнях. Непрадказальныя, зноў-жа.



**– І як гэта выяўляецца?**

– Зараз пабачыш, мой аповяд падыходзіць да самага цікавага. Значыць, выправіліся мы ў клюб, патаньчылі там ад душы колькі часу. На гадзіньніку было недзе чатыры раніцы, калі мы выйшлі на вуліцу ў даўнтаўне Мангэтану. Спынілі таксоўку, селі ў яе. Нечакана адзін з нас прамаўляе: “Беларусы! Вясёлы атрымліваецца вечар, так не хочацца, каб ён скончаўся! Трэба працягваць!” Дзе? “У Маямі, дзе-ж яшчэ! Там і мора, і клюбы, і суполку ЗБМА ня блага было-б стварыць!” Карацей, ня доўга думаючы, селі мы ў самалёт і паляцелі ў Маямі.

**– ???**

– Не адразу, канешне. Але спантанна ды наўпрост. Кіроўцу таксі загадалі ехаць адразу ў бліжэйшы аэрапорт. Той крыху зьдзівіўся, але прывёз у “Ля Гвардыю”. Адразу па прыбыцьці, набылі квіткі на бліжэйшы рэйс да Маямі, і ўжо праз паўгадзіны ўзялі курс на Дэтройт, дзе ў нас была перасадка. А яшчэ праз некалькі гадзін на поўныя грудзі ўдыхалі цёплае флярыдзкае паветра.

**– А як-жа багаж? Хоць рэчы якія былі з сабою?**

– Якія рэчы? Як прыйшлі ў бар, так у Маямі і паляцелі. На мне, напрыклад, быў апрануты пінжак, сярод рэчаў – толькі тэлефон ды крэдытныя карткі. Тое-ж і ў іншых. Прычым, калі ў Нью-Ёрку было даволі прахладна, то ў Маямі – градусаў дваццаць шэсць ды вада ў моры – дваццаць тры! Нічога, набылі купальныя аксэсуары, пераапрануліся, – і ў воду. Такім чынам, з моманту прыняцьця рашэньня працягнуць беларускую сустрэчу і да таго, як мы купаліся ў цёплым акіяне, прайшло гадзін шэсць.

**– Неверагодна!**

– Я і сам зараз, распавядаючы пра ўсё гэта, на момант задумаўся, а ці было ўсё на самой справе? Не, канешне было. Вось так можа адпачываць беларуская моладзь! На жаль, не было кантактаў нікога зь мясцовых землякоў, каб вырашыць арганізацыйна-нацыянальныя справы. Да таго-ж інтэрнэту бракавала, і зарад тэлефонаў хутка скончыўся.

**– На колькі затрымаліся ў Флярыдзе?**

– Прабылі ў Маямі той дзень, калі прыляцелі, перанапачавалі і назаўтра вечарам накіраваліся дамоў – у Нью-Ёрк. На тым і скончыўся арганізаваны ЗБМА вечар, які пачаўся... два дні таму. Прыходзьце на нашыя сустрэчы і, верагодна, нешта падобнае можа здарыцца з вамі!

***Ільля КУНІЦКІ***

Bielarus553C.qxd 2/3/2009 6:30 PM Page 7




# Весткі й Паведамленьні

нью-ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня

Viestki j Paviedamlenni

Belarusan American Association, Inc.

166-34 Gothic Drive, Jamaica, N.Y. 11432 Сусьветнае сеціва: *www.baza-belarus.org*

№ 2 (517)


# Студзеньскі сход аддзелу БАЗА

У нядзелю 11 студзеня ў Фундацыі імя П. Крэчэўскага ў Кўінсе адбыўся чарговы, студзеньскі сход аддзелу БАЗА. Напачатку старшыня аддзелу В. Зайка азнаёміў прысутных з падзеямі ў Беларусі за апошні месяц. У прыватнасьці былі ўзгаданыя дэвальвацыя на 20% беларускага рубля, якому папярэднічаў прымусовы продаж дзяржаве валютных сродкаў прадпрыемствамі Беларусі; падрыхтоўка візыту Лукашэнкі ва Ўкраіну; нявызначанасьць цаны расейскага газу для Беларусі, што застаецца сродкам ціску ў справе прызнаньня ёю Асеціі-Абхазіі; пляны рэжыму пабудаваць атамную станцыю на Астравеччыне; абвешчаньне 2009 году “Годам роднай зямлі”. Асобна прамоўца спыніўся на 90-годзьдзі абвешчаньня БССР, як выніку ўплыву Акту 25 Сакавіка 1918 году, кампрамісу бальшавікоў з нацыянальна-арыентаванымі беларускімі левымі сіламі і зьменаў у міжнародным становішчы.

Затым з прэзэнтацыяй пра гэбрайскую музыку ў Беларусі выступіў музыколяг і выканаўца, актор і фальклярыст Зьміцер Сьляповіч. Да пераезду ў Нью-Ёрк сп. Сьляповіч выкладаў на катэдры беларускай музыкі ў Беларускай Акадэміі Музыкі ў Менску, а такасама ў гімназіі пры Акадэміі. Ад 2001 году, сп. Сьляповіч бярэ ўдзел у экспэдыцыях па зборы гэбрайскага музычнага фальклёру Беларусі. Ён музыка-клэзмэр (г. зн. выканаўца традыцыйнай музыкі ў складзе гэбрайскай музычнай капэлі), клярнэтыст і вакаліст. Сп. З. Сьляповіч выступаў з клэзмер-групай “Мінскер капэлье” па гарадох Беларусі й Эўропы. Днямі выйшла кампакт-кружэлка “Мінскер капэлье”, а ў сеціве можна паслухаць пэрформанс “Жыдовішча” ў выкананьні капэлі й сп. Сьляповіча па адрасе: ***http://www.last.fm/music/Minsker+Kapelye/Zhydowiszcza-3+Live+(2008)***. Акрамя гэтага сп. Сьляповіч выступае ў ідыш-тэатры “Фолксбінэ” ў Нью-Ёрку.

Коратка расказаўшы пра сябе і свае зацікаўленьні, выступоўца адзначыў блізкасьць лёсаў беларусаў і гэбраяў у Беларусі. Нягледзячы на адрознасьць культуры, мовы, рэлігіі й сьветапогляду, сумеснае жыцьцё разам на адной зямлі на працягу стагодзьдзяў наблізіла беларусаў і гэбраяў, выклікала ўзаемную зацікаўленасьць. Культурнае ўзаемадзеяньне на працягу доўгага часу стала выяўляцца і ў музычнай культуры. Беларускія гэбраі, або літвакі, сталі выразна адмысловай групай у складзе эўрапейскага гэбрайства, ашкеназаў. Яны характэрызуюцца сваёй мовай (паўночна-ўсходняя гаворка, “літвіш” ідыш), традыцыямі, некаторымі рэлігійнымі й літургічнымі рысамі (“нусах Літэ”), пэўнай самасьведамасьцю. Тыповы гэбрай-літвак лічыўся старанным дасьледчыкам Торы і Талмуду, экспэртам у складаных пытаньнях рэлігійнага рытуалу. Менавіта ў “літвацкіх” гарадох і мястэчках Беларусі (Валожын, Мір, Клецк, Ліда, Слуцак, Горадня) паўсталі славутыя ешывы — рэлігійныя акадэміі, што сталі вядомыя па ўсім сьвеце. Таму гэбраі па ўсёй Усходняй Эўропе лічылі прэстыжам выдаць дачку за літвака, асабліва за студэнта або выпускніка ешывы.

Як паўсюль у Эўропе, культурныя асаблівасьці гэбрайскай дыяспары ў Беларусі былі абумоўленыя кантактамі з суседзямі, мясцовым насельніцтвам. Гэта выразна бачна ва ўзаемных музычных уплывах. Беларусы і гэбраі гралі ў невялікіх капэлях, складаўся пэўны музычны стыль. Менавіта дасьледваньнем яго і займаліся экспедыцыі, у якіх бралі ўдзел сп. Зьміцер Сьляповіч і яшчэ адна выдатная дасьледчыца беларускай гэбрайскай музыкі, ужо, нажаль, нябожчыца, Ніна Сьцяпанская. Фактычна гэта былі першыя досьледы народнай гэбрайскай музычнай культуры Беларусі.



Зьміцер Сьляповіч

Прафэсійная гэбрайская музычная культура вядомая досыць добра. У 19-м і 20-м стагодзьдзях яна дала такіх выдатных выканаўцаў як Міхоэл-Ёсэф Гузікаў са Шклова, Юда Жухавіцкі, Герман Саламонаў, Мэндэль Альпяровіч. Хоць наогул гэбрайская народная музыка, уключна з клэзмерскай музыкай, запісана і дасьледвана досыць грунтоўна, аднак менавіта на беларускіх землях яна дасьледвана найменш. Некаторыя сьведчаньні ёсьць у мэмуарнай літаратуры, напрыклад у П. Венгеравай ды інш. Пэўная інфармацыя ёсьць у публікацыях Мойшэ Берагоўскага, Соф’і Магід, Іны Назінай, А. Двілянскага ды іншых дасьледчыкаў, але тым ня менш экспедыцыі Сьляповіча і Сьцяпанскай фактычна ўпершыню зрабілі менавіта беларускі гэбрайскі фальклёр прадметам фіксаваньня і досьледу.

Выступоўца спыніўся на клэзмэрскай інструмэнтальнай музыцы, паказваў узаемныя ўплывы беларускай і гэбрайскай музычных традыцыяў. Клэзмерскія капэлі складаліся з 3-5 чалавек, цымбалы-труба-скрыпка або 2 скрыпкі й басэтля. Музыкі гралі на вясельлях ды іншых нагодах, паміж імі існавала канкурэнцыя, традыцыя была жывой і запатрабаванай. Тады склаліся ўзаемныя ўплывы, іх адлюстраваньнем у мэлёдыях і песьнях сталі, напрыклад, беларускамоўныя ўстаўкі ў песьнях на ідыш ці беларуская полька ў міноры, полька-шабасоўка і г. д.

У канцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў, калі адраджалася беларуская культура, пачала таксама адраджацца культура гэбрайская, узьнікла цікавасьць да гэбрайскай традыцыйнай музыкі й песьняў. Праяўлялася ўвага з боку дзяржавы, выступы праходзілі ў вялікіх залях. Цяпер гэтага няма. Фальклёрная калекцыя Соф’і Магід, матэрыялы экспэдыцыяў 2001-2007 гг. неапублікаваныя. Тым ня менш цікавасьць да клэзмерскай традыцыі існуе, і “Мінскер капэлье” выдала новую кружэлку “Тутэйшыя — Ды Ортыкэ”. Існуюць клюбы гэбрайскай музыкі, тры гады назад адбыўся фэст “Клэзмэр-шок”. Прэзэнтацыя сп. Сьляповіча суправаджалася выкананьнем мэлёдыяў на клярнэце і вакальным выкананьнем песень на ідыш. Прысутныя з энтузіязмам успрынялі прэзэнтацыю, сп. Сьляповіч адказаў на пытаньні.

Затым з аналізам апошніх падзеяў у Беларусі выступіў Старшыня Беларускага Народнага Фронту Зянон Пазьняк. Ён у прыватнасьці спыніўся на эканамічным крызісе ў Беларусі й дэвальвацыі беларускага рубля. “Тое, што сёньня адбываецца ў Беларусі, павінна настройваць на пэўныя рэфлексіі. Разьвіцьцё і паглыбленьне крызісу – гэта фактычна вынік дзейнасьці вузкага кола людзей, якія прывязалі адну збочаную эканоміку да другой збочанай эканомікі. Фінансавая сыстэма Расеі — заганная, яна ня здольная рабіць вялікія інвэстыцыі, падтрымліваць вялікія праекты. Усё робіцца для захаваньня ўлады ў руках партыйна-кэгэбісцкай групоўкі. На пытаньне, хто выклікаў крызіс у Беларусі, хто вінаваты — адказ адзін: гэта зрабіў Лукашэнка. Прычына крызісу, перш за ўсё, дзейнасьць антыбеларускага рэжыму і яго наўмысная прывязанасьць да эканамічнай палітыкі (ці хутчэй — да адсутнасьці яе) ў Расеі. Крызіс пачаўся ў канцы лета 2008 году, Беларусь выдаткоўвала свае золатавалютныя запасы, замест умацаваньня ўнутранага рынку Лукашэнка працягваў зьнішчаць яго. І вось цяпер – дэвальвацыя, спроба аздараўленьня эканомікі за кошт насельніцтва. У краінах з нармальнай эканамічнай сыстэмай гэта прыймальна, гэта адзін з інструментаў рэгуляцыі. Але ў Беларусі цяпер адзіны інструмант рэгуляцыі — сваволя рэжыму, якому не патрэбныя ні культура, ні вольны чалавек, ні нармальнае прадпрымальніцтва як частка эканомікі. Бо што ёсьць прадпрымальніцтва — гэта сярэдняя кляса, на якой паўсюль у сьвеце і трымаецца грамадзтва, дзяржава. А Лукашэнка заяўляе: “З радасьцю пацісну руку апошняму прадпрымальніку”. Таму рэжым гэты ня тое што антынацыянальны, ён — антычалавечы. Крызіс, дэвальвацыя — гэтыя рэчы павінны працьвярозіць людзей, бо ясна бачна, што ў рэжыму няма канцэпцыі, няма праграмы разьвіцьця, няма нават разуменьня сытуацыі.

Аднак, што робіць “эліта”, т. зв. аналітыкі й апазыцыянэры? Эканаміст Л. Заіка заклікае пагадзіцца на ўвядзеньне расейскага рубля, г. зн. на ліквідацыю незалежнасьці. Ужо здавалася, што групка маргінальнай апазыцыі прапанавала стварыць структуру пры адміністрацыі прэзыдэнта, і ім кінулі костку, зрабілі групку па пытаньнях маркетынгу й інвэстыцыяў. Але хто можа сур’ёзна ўспрымаць такое “ратаваньне” эканомікі. Цяпер вось А. Лябедзька з АГП заявіў: “Мы гатовыя ўзяць адказнасьць за тое, што адбываецца ў краіне”. Дык-жа апазыцыя ня можа браць удзел у выканаўчых структурах, гэта падставовыя рэчы!

Тое, што адбываецца — гэта вынік дзейнасьці рэжыму, які руйнуе нацыю і дзяржаву. Нацыя мусіць аб’яднацца і вытурыць гэты рэжым, каб трэскі ад яго паляцелі! Рэжым у крытычным стане — трэба не ратаваць яго, а ліквідаваць. Таму ня трэба палохацца крызісу, трэба дзейнічаць на карысьць нацыі і ясна бачыць свае мэты і. А гэтая карысьць ёсьць менавіта вызваленьне нацыі ад сёнешняга антынацыянальнага рэжыму.”

Далей у разьдзеле “Рознае” адбыліся знаёмствы з новымі людзямі — па традыцыі госьці аддзелу коратка распавядалі пра сябе. Прагучалі аб’явы і паведамленьні. Затым прысутныя маглі працягвалі калегаваньне, частуючыся кавай.

***Віталь ЗАЙКА***

*Здымак Анатоля Старкова.*

## Наступны сход

нью-ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **8 лютага 2009 году** ў Фундацыі імя П. Крэчэўскага па адрасу:

***166-34 Gothic Drive, Jamaica, NY 11432***

Даезд цягніком падземкі **F** да прыпынку **169th St.**; адтуль прайсьці 2 блёкі да скрыжаваньня **167-й вул.** і **Готык Драйв.** Пачатак сходу а 1:00 папаўдні.

## Уплаты ў нью-ёрскі аддзел БАЗА
### Ахвяраваньні й складкі:

| | |
|---|---|
| М. Балтрушка. . .50 | Н. Карповіч. . . . . 50 |
| Н. Герсімовіч. . . .50 | Ю. Ляоненка. . . .50 |
| У. Герасімовіч. . .50 | Г. Няфёдава. . . . .50 |
| А. Грошаў. . . . . . . 50 | Л. Семянкова. . . 50 |
| В. Грычэнок. . . . .50 | П. Чурун. . . . . . . . 50 |
| С. Дземяшонак. .50 | С. Широкі. . . . . . 50 |
| В. Едзіновіч. . . . . 50 | Ю. Лапіцкі. . . . . .30 |
| І. Камолаў. . . . . . 50 | Шчыры дзякуй! |

**Уплаты ў нью-ёрскі аддзел дасылайце на:**
*Belarusan American Association*
*P. O. Box 230249*
*Brooklyn, NY 11223*
**Чэкі выпісвайце на**
*Belarusan American Association.*

Bielarus553C.qxd 2/3/2009 6:30 PM Page 8



## Наша відэатэка

# “Кліп-марафон” падводзіць вынікі: якое яно — лепшае музычнае відэа мінулага году?




Музычны кліпмэйкінг – зьява ў айчыннай нацыянальнай культуры ўжо даволі сталая. Яго гісторыя была запачаткаваная разам з нацыянальным рок-рухам, увесь час існавала паралельна яму. Айчыныя рок-выканаўцы яшчэ ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагодзьдзя зразумелі, што ўдалы кліп на добрую песьню можа зрабіць для папулярнасьці гурта вельмі значны ўнёсак, дазволіць прыцягнуць увагу шырокіх колаў слухачоў, стымуляваць іх набываць альбомы гурта. Гэткую актуальнасьць кліпмэйкінгу, як сродку камунікацыі слухачоў і выканаўцаў, упершыню выкарыстаў гурт “Бонда”, удзельнікі якога з дапамогай рэжысэра Генадзя Шувагіна, стварылі першы беларускі відэа-кліп на песьню “Ура!” Як падкрэсьліў у артыкуле для “Беларускай энцыкляпэдыі” (1997) вядомы беларускі музычны крытык Вітаўт Мартыненка, “Ура!” Г. Шувагіна і “Бонды” – першы прыклад дакладана стылістычна вывеванага панятку “відэа-кліп” у сучасным беларускім кіна- і музычным мастацтве.

Але дзе-ж гэтыя працы можна ўбачыць, зрабіць свае высновы зь відэа-шэрагу, які адлюстроўваў тагачасныя рэаліі, што панавалі ў Беларусі ў пару нацыянальнага адраджэньня 80-90-х годаў XX-га стагодзьдзя? Дзе пазнаёміцца з новымі ідэямі і распрацоўкамі айчынных кліпмэйкэраў? Адказаць на гэтыя пытаньні ўзяліся маладыя актывісты Культурніцкай камісіі Партыі БНФ Франак Вячорка, Міхал Нядзьвецкі, Адам Птушка. Менавіта зь іх ініцыятывы ўпершыню ў Беларусі распачаўся праект “Кліп-марафон”, які анансаваўся як рэтраспэктыўны для гісторыі стварэньня айчынных відэа-кліпаў, як спроба пазнаёміць шырокія колы прыхільнікаў айчыннай рок-музыкі з новымі працамі кліп-мэйкераў, якія працуюць з беларускамоўнымі выканаўцамі. Апошняя акалічнасьць прымусіла тутэйшых адэптаў “моўнай чысьціні” зноў узьняць вэрхал: а як-жа “выдатныя” кліпы расейскамоўных “Ляписа Трубецкога” ці “Дроздов”, чаму яны не разглядаюцца журы “Кліп-марафону”? Да гонару арганізатараў, тыя цьвёрда адмежаваліся ад моўных інсынуацыяў, якія былі накіраваныя на дыскрэдытацыю самой ідэі “Кліп-марафону” і прысьвяцілі праект выключна беларускамоўнай відэа-музыцы. Так было летась, так сталася і сёлета, калі ганараваньне лепшых кліпмэйкераў 2008 году супала з праззэнтацыяй DVD “Кліп-марафон 1988-2008. Найлепшыае беларускае музычнае відэа”. Пра падрыхтоўку гэтага рэлізу ініцыятыўнай групай “Кліп-марафону” было заяўлена яшчэ ў 2007-м годзе. І вось доўгачаканы DVD стаў набыткам беларускіх мэляманаў. Што цікавага чакае на яго трэках сучаснага слухача і прыхільніка нацыянальнай плыні ў айчынным рок-руху?

Адказ на гэтае пытаньне можна знайсьці, калі пазнаёміцца з рубрыкамі DVD “Кліп-марафону 1988-2008.” Гістарычную цікавасьць слухачоў, безумоўна, выкліча рубрыка “Эксклюзіў”, у якой прадстаўлены першыя працы айчынных кліпмэйкераў: Э. Гатоўскага, які здымаў кліпы на “цяжкія” кампазыцыі гурта “Рэй”, Г. Мікалаева, які супрацоўнічаў з легендарнай “Мрояй” (кліп на песьню “Я – рок-музыкант”), а таксама, памянёны Г. Шувагін – аўтар незвычайнага відэа-кліпу “Ура!” гурта “Бонда”. І хоць тыя відэа-працы былі створаныя ў модным тагачасным “перабудовачным” ключы, яны захавалі дух часу, калі нацыянальнай адраджэньне стала рэальнай сілай беларускага грамадзтва, а слова “сьвядомы” не было лаянкай, як пры цяпер. Да таго-ж, цікава з чыста чалавечага пункту гледжаньня пабачыць, як ў тыя часы выглядалі сёньняшнія рок-куміры – Ігар Варашкевіч, Янка Маркаў, Лявон Вольскі ці Ільля Шэўчык...

Адзін зь вельмі складаных відаў кліпмэйкінгу – анімацыйны. І тут ў беларускіх выканаўцаў ёсьць пэўны досьвед працы з каляровымі вобразамі, якія “ажылі” з дапамогай кампутарнай тэхнікі. Гэтыя кліпы ахвотней, нягледзячы на іх беларускамоўнасьць, дапускаюцца ў этэр дзяржаўных музычных каналаў. Як гэта адбывалася з арыгінальнымі працамі М. Сабурава, А. Хацкевіча і М. Сколкава, якія зьявіліся аўтарамі відэа-кліпаў да песень “Крамбамбулі” – “Госьці” ды “Турысты”. Цікава, што пераможцамі “Кліп-марафону-2008” у намінацыі “Анімацыя” стаў цудоўны кліп “Тры янгалы” на кампазыцыю гурта “Троіца”. “Тры янгалы” – сапраўдны шэдэўр кліп-мастацтва рэжысэра С. Змітрэнкі, у працы якога гарманічна спалучаюцца старажытныя фальклёрныя архэтыпы, народная філязофія, сучасныя ўрбаністычныя і псыхадэлічныя вобразы і алюзыі... З гэтай працай аматары айчыннага кліпмэйкінгу могуць пазнаёміцца з DVD “Кліп-марафон 1988-2008. Найлепшыае беларускае музычнае відэа”. Як і з кампутарна-анімацыйным кліпам А. Асадчага на песьню “Крамы” “Падае дождж”, які быў вызначаны лепшым па рашэньню арганізатараў “Кліп-марафону-2008”. Адзначу, што, нягледзячы на некаторую схематычнасьць вобраза самога выканаўцы, кліп А. Асадчага і гурта “Крама” даволі трапна перадае эмацыйны строй гэтай цудоўнай баляды, насычанай шматлікімі кампутарнымі “разынкамі”, якія глядзець цікава і захапляльна...

Рэжысэр А. Лобач і ягоны твор – відэа-кліп на песьню гурта Neuro Dubel “Танкі” ў выкананьні гурта Ігара Загумёнава zIGZAG быў вызначаны глядацкім журы “Кліп-марафону-2008” у намінацыі “Пэрформанс”, маючы на ўвазе тое, што ў ягоных здымках былі задзейнічаны шматлікія акторы й акторкі. Трэба адзначыць, што гэты прыз для Ігара і ягонай каманды кліпмэйкераў – заслужаны.



*Арганізатары “Кліп-марафону-2008” уручаюць лідэру гурта zIGZAG Ігару Загумёнаву (другі справа) прыз пераможцы ў намінацыі “Пэрформанс”.* Здымак аўтара.

Бо з самага пачатку гурта, музыкі аддаюць перавагу стварэньню відэа на сваю музыку. Гэты працэс распачаўся кампутаным кліпам “Пабудзі мяне”, які меў арыгінальныя працяг – кліпы “Кастрычнік” і “Кастрычнік-2”. Зацікавіў гледачоў і постіндустрыяльны, мінімалісцкі, з элементамі наіўнага мастацтва, кліп на актуальную песьню “Тры расейскія літары”. І вось перамога на “Кліп-марафоне-2008”! Посьпеху паспрыяў ўдзел у здымках лідэра гурта Neuro Dubel Аляксандра Кулінковіча, зь якім здымачная група кліпу “Танкі” па праву падзяліла гэты посьпех.

На жаль, на дыску не знайшлося месца яшчэ аднаму кліпу-трыюмфатару “Кліп-марафону-2008” – відэа на песьню “Дажджамі” гурта :B:N, якую прызналі лепшая відэапрацай у намінацыі “Альтэрнатыва”. Кліп, сапраўды, мае моцны, хоць і мінімалісцкі, відэа-шэраг, цудоўны, яркі малюнак, які так гарманічна падкрэсьлівае дынаміку музычнай кампазыцыі. Гэтую якасьць кліпу :B:N забясьпечыла тэхнічная база тэлеканалу “БЕЛСАТ”, на якой здымаліся і іншыя цікавыя кліпы беларускіх гуртоў. Адзначу тут у першую чаргу кліп на песьню “Калыханка” гурта Mauzer (рэжысэр П. Квасьнеўскі), анімацыйную працу Л. Мольскага на песьню “Да цябе” Тацьцяны Беланогай, псыхадэлічныя кліпы “Край” ад гурта Neuro Dubel і “Нечакана” гурта “Тарпач” (рэжысэр абодвух працаў Р. Бвашчак)... Ня трэба шкадаваць, што відэа на песьню “Дажджамі” няма на прэзэнтаваным дыску, затое, тут зьмяшчаны іншы кліп гэтай каманды – “Крылы”.

Акрамя адлюстраваньня вынікаў працы глядацкага журы конкурсу “Кліп-марафону-2008” новы DVD зьмяшчае шмат рарытэтнага відэаматэрыялу. Як тут не зьвяруць увагу на кліп А. Вечара “Гомельскі вальс”, у якім гучаць сьпевы гуртоў “Крама”, “Палац” і Анатоля Ярмоленкі зь “Сяброў”. Мо таму гэты кліп доўга лічыўся згубленым, што занадта ў нявыгадным, апазыцыйна-крытычным сьвятле “выстаўляў” перад уладамі лідэра “Сяброў”, які цяпер так імпэтна сьпявае за “бацьку”. Але вось ён – доказ таго, што і дзяржаўныя “Сябры” калісьці мелі сапраўднае патрыятычнае пачуцьце, якое разьбілася ў сутыкненьнях з жорсткай рэчаіснасьцю сучаснай культурнай палітыкі цяперашняй Беларусі.

На DVD “Кліп-марафон 1988-2008”, акрамя сучасных відэаартэфактаў, упершыню найпаўней сабраныя цікавыя беларускія кліпы, якія зьяўляюцца ня толькі гістарычнымі, але і эстэтычнымі ўзорамі для айчыннага кліпмэйкінгу. Нельга не абмінуць у гэтай сувязі такія музычныя відэа-стужкі, як «De la musique avant toute chose» гурта «Deadmarsh» (на верш М. Багдановіча) ці легендарных “Цэпелінаў” ад “Новага Неба”. Тоеж можна казаць і пра настраёвую відэа-працу лідэра гурта «P.L.A.N.» Андрэя Плясанава, які ў якасьці прафэсійнага кінарэжысэра прадставіў свой поўнафарматны кліп на песьню “Шлях да каханай”, ці ўспомніць дынамічны сымбалізм кліпа гурта «Znich» зь песьні “Крыжыабярэгі”, зь якой музыкі сталі пераможцамі “Кліп-марафону” ў 2007 годзе.

Як адзначыў прысутны на “Кліп-марафоне-2008” кінакрытык Андрэй Расінскі, сёньня беларускі кліпмэйкінг знаходзіцца на шляху да новых творчых вяршынь, да рэалізацыі цікавых ідэяў і крэатыўных падыходаў. І выданьне такога маштабнага DVD – сьведчаньне сталеньня айчынных выканаўцаў і кліпмэйкераў. Галоўнае, творча асэнсоўваць дасягненьні і вопыт, каб напрацоўкі айчыннага кліпмэйкінгу дазволілі ў будучым казаць пра нацыянальную школу стварэньня музычнага відэа.

***Анатоль МЯЛЬГУЙ,***
***музычны аналітык***

# Выхад з крызісу

*Заканчэньне з бачыны 1*

ма. Крэдыты ад МВФ (можаце лічыць гэта за жарт) патрацяць на пабудову лядовых палацаў у “Казючыках” (адпрацаваная форма “адмыўкі” грошай і крадзяжу).

Ашчадны выхад з крызісу, паўтаруся, вымагае толькі палітычнага рашэньня – ліквідацыі рэжыму, які гэты крызіс падрыхтаваў. Дзеля гэтага трэба, мінімум, наяўнасьць пратэстных настрояў у грамадстве і наступная іх кансалідацыя на ідэі зьмены кіраўніцтва і вяртаньня законнай Канстытуцыі 1994 года, якая дасьць магчымасьць хутка ўпарадкаваць нармальную сыстэму ўлады ў краіне. Адпадаюць усе пытаньні пра “палаткі”, “сэнат”, “вертыкаль”, выбарчае заканадаўства і пра аўтарытарнага прэзыдэнта. У Беларускай дэмакратычнай Канстытуцыі, якую незаконна адмяніў Лукашэнка, усё напісана, як рабіць.

У падрыхтоўцы людзей да патрабаваньня зьмены збанкрутаванай улады ўзурпатараў і фальсыфікатараў ёсьць першыя крокі да палітычнага выхаду з крызісу і задача грамадзянаў краіны. Найперш бачу ў гэтым галоўную задачу тых патрыётаў, якія стаяць на пазыцыях Адраджэньня, змаганьня, незалежнасьці і беларускай дэмакратыі і не пабеглі, як так званая вікаўская “апазыцыя”, прасіцца на службу да рэжыма, каб дапамагчы ацалець прамаскоўскай ўладзе. Крызіс ужо расстаўляе шмат што на сваё месца. Небясьпеку для незалежнасьці Беларусі уяўляе ня крызіс, а існуючы антыбеларускі рэжым. Каб ратаваць краіну трэба не падтрымліваць рэжым, а зьнішчыць яго. Трэба скарыстаць крызіс, каб ліквідаваць уладу цемры. Беларусам даецца шанец. Пасьля крызісу павінна стаць выздараўленьне. Але патрабуецца толькі адно – хваробу перамагчы. Б

Bielarus553C.qxd 2/3/2009 6:30 PM Page 9



# Беларусь-Амэрыка: лёсы землякоў



## Аляксандар БАРМІН (1899-1987)

Пакручастая лінія жыцьця Аляксандра Барміна, былога савецкага вайскоўца, які стаў дыпляматам і выведнікам, а затым — кіраўніком расейскай службы "Голасу Амэрыкі", вартая некалькіх дэтэктыўных раманаў.

А. Бармін нарадзіўся ў Магілёве, жыў у Вільні, Гомелі й Кіеве, вучыўся ў гімназіі. Зь першых дзён рэвалюцыі ў Расеі з энтузіязмам далучыўся да яе, уступіў у партыю бальшавікоў. Браў удзел у вайсковых дзеяньнях на баку чырвоных супраць кайзэраўцаў, дырэкторыі й Украінскай Народнай Рэспублікі. Вучыўся на Менскіх вайсковых курсах у Гомелі, браў удзел у баях супраць польскіх войскаў і Дабравольчай арміі Дзянікіна. У 22 гады ён стаў камдывам (камуністычным генэралам). Затым былі вучоба ў Вайсковай акадэміі й Інстытуце ўсходніх моваў у Маскве. Бармін браў удзел ва ўсталяваньні савецкай улады ў Бухары і працаваў у савецкіх дыпмісіях у Бухары, Латвіі, Пэрсіі, Італіі й Бэльгіі, узначальваў зьнешнегандлёвыя фірмы "Міжнародная кніга", "Аўтамотаэкспарт".

Таксама ён быў зьвязаны з ГПУ, вёў выведную працу за мяжой і ведаў шмат пра апэрацыі ГПУ па выкраданьні й ліквідацыі ворагаў савецкага рэжыму на Захадзе. У гэты час Бармін не знаходзіўся ўбаку ад палітычных дыскусіяў унутры кампартыі, падтрымліваў апазыцыйныя фракцыі, сымпатызаваў Троцкаму. Ён добра ведаў вялікую колькасьць вышэйшых кіраўнікоў Саветаў, сустракаўся з Сталінам. Молатавам, Кагановічам. Падчас дыпляматычнай працы Барміна ўражваў кантраст паміж жыцьцём працоўных у "логаве капіталу" Заходняй Эўропе і ў "пралетарскім раі" – СССР. З 1935 году А. Бармін працаваў на дыпляматычнай службе ў Грэцыі, адначасна займаючыся выведкай.

У 1937 годзе Барміна прызначылі часовым паверaным ў справах (кіраўніком амбасады) у Грэцыі. У той час па замежных прадстаўніцтвах пракацілася хваля рэпрэсіяў супраць "старых" бальшавіцкіх кадраў — дзясяткі і можа сотні супрацоўнікаў дыпмісіяў адклікаліся ў Маскву і зьнікалі у пашчы савецкай рэпрэсіўнай сыстэмы. Калі пасьля чарговага наведваньня Масквы Бармін неасьцярожна падзяліўся шчырымі думкамі пра савецкі сацыялізм і сталінскі рэжым з сваімі падначаленымі, ён стаў адчуваць, што над ім зьбіраюцца хмары — нехта робіць вобшукі ў працоўным кабінэце, перасталі прыходзіць прывітаньні ад калегаў-дыпляматаў з іншых эўрапейскіх прадстаўніцтваў й г. д. Бармін добра ведаў, што адбываецца з тымі, каго раптоўна выклікаюць у Савецкі Саюз. Таму, калі яго сталі выклікаць у Маскву, Бармін стаў пад рознымі прычынамі адцягваць ад'езд. Затым у порце Пірэй стаў на якар расейскі параход, і капітан яго пачаў настойліва запрашаць кіраўніка савецкай дыпмісіі на філіжанку гарбаты. Контр-прапановы сустрэцца ў амбасадзе або нейдзе ў горадзе настойліва адкідаліся капітанам. Бармін прыпомніў выпадкі, чутыя ад знаёмых гэпэвушнікаў, калі былых белагвардзейцаў і ўпартых савецкіх супрацоўнікаў выкрадалі й на параходах перапраўлялі ў Саветы. Рашэньне сасьпела вокамгненна: Бармін адаслаў тэлеграму ў Наркамзамежсправ, што бярэ адпачынак, і з дапамогай сяброў-грэкаў перапраправіўся ў Францыю. Так Бармін стаў "невяртанцам", поруч з такімі асобамі як дыпляматы Ф. Раскольнікаў, Г. Бесядоўскі, выведчыкі Н. Рэйс, Г. Люшкоў, А. Арлоў, В. Крывіцкі.

У Францыі адбылася хуткая трансфармацыя перакананага камуніста, якога ўжо наведвалі сумлевы ў слушнасьці савецкай сыстэмы – у трацкіста, а затым у ня менш перакананага антыкамуніста. "Калі-б прыйшлося пачынаць спачатку, з Кастрычніцкай рэвалюцыі — я-б моцна задумаўся, уважаючы на тое, да чаго гэта ўсё прывяло". У Францыі агенты НКВД чуліся ня горш, чым у Грэцыі, за Барміным і ягонай каханкай пільна сачылі, іхнае жытло абшуквалася, і нават француская паліцыя не магла нічога зрабіць.

Бармін уладкаваўся на працу ў кампанію "Эр Франс", і адначасна стаў пісаць кнігу "Мэмуары савецкага дыплямата", якая выйшла па-французку ў 1938 г. Калі ў Францыі сталі адзін за адным гінуць апанэнты сталінскага рэжыму, Бармін мусіў перабрацца ў Злучаныя Штаты. Як фунцыянэру высокай рангі савецкага рэжыму, Барміну быў дадзены палітычны прытулак (азыль) у 1940 г., але допыту і збору інфармацыі ад яго не праводзілася, што адлюстроўвае ізаляцыянісцкае стаўленьне тагачасных кіруючых колаў ЗША ў міжнародных справах.

Бармін працаваў на заводзе, потым стаў працаваць у радёперахопе, а ў 1942 г. шарагоўцам мабілізаваны ў амэрыканскае войска. Затым Бармін працаваў ва Ўправе Стратэгічных Службаў (папярэднік ЦРУ) перакладчыкам і дарадцам па пытаньнях СССР. Аднак у 1944 г. Бармін быў звольнены з УСС за артыкул у "Рыдэрз Дайджэст" супраць занадта прасавецкага курсу Рузьвэльта. У 1945 г. Бармін выдаў аўтабіяграфічную кнігу "Той, што выжыў", пра першую палову свайго жыцьця. У ёй аўтар, поруч зь біяграфічнымі фактамі, даў глыбокі аналіз савецкай сыстэмы, і зрабіў нацiск на адрозьненьні Сталіна і ягонай дыктатуры і ўласна народу, заклікаў не прыпісваць Сталіну перамогі ў вайне.

З 1948 году Бармін працаваў на радыё "Голас Амэрыкі", неўзабаве ўзначаліўшы ягоную расейскую рэдакцыю. У 1964-1972 гг. быў дарадцам Інфармацыйнай Агенцыі ЗША (ЮСІА), шмат друкаваўся па "савецкім пытаньні".

Цікавы факт — А. Бармін некаторы час быў жанаты на ўнучцы прэзыдэнта Тэадора Рузвэльта, і меў дачку ад яе, але яны неўзабаве разышліся. Ненадрукаванай застаецца другая частка мэмуараў Барміна, якая мае цікавыя зьвесткі пра палітыку Саветаў у галіне выведкі й міжнародных адносінаў, а таксама пра жыцьцё Барміна пасьля 1937 году.

**Віталь ЗАЙКА**

## Калядны рэйд ТБШ

*Заканчэньне з бачыны 3*

разьвіваюць у дзяцей мастацкія здольнасьці (сьпевы, танцы, выцінанка і г. д.). Гэта – Алена Туміловіч, Вікторыя Бельчанка, Натальля Гамаюнава, Ірына Моніна. Але настаўніцкі калектыў гімназіі ўнікальны. Тут працуюць выдатныя філёлягі-моваазнаўцы, якія выкладаюць швэдзкую, кітайскую, польскую ды ангельскую мовы па-беларуску, якія вартыя адмысловых ўзнагародаў ад ТБШ.

Дзіцячым садкам № 187, дзе гадуюцца 4 групы беларускамоўных дзетак, і № 534, які мае аж 12 беларускіх групаў, вельмі пашанцавала з загадчыцамі. Гэта дачуваецца адразу, калі ўваходзіш у садочкі. Тацьцяна Юрчык, загадчыца дзіцячага садка № 187 і Ларыса Ўрулёва, загадчыца дзіцячага садка № 534, атрымалі дыплёмы ТБШ за неабыякавае стаўленьне да сваёй працы. Пра такіх кажуць, што яны аддаюць працы ўсю душу. Яны здолелі ня толькі сабраць найлепшых дашкольных пэдагогаў, зрабіць музэі, знайсьці сучаснае абсталяваньне, здабыць мільёны цацак-лялек, нават зрабіць жывы куточак з хамячком і чарапашкамі, але і пасяліць беларускі дух ў свае садочкі.

А наогул, ў Менску існуе каля 100 беларускіх групаў у садках. ТБШ яшчэ наведала дзіцячы садок № 202, дзе ёсьць 2 беларускія групы. Пэдагогі гэтага садочка распавядалі пра жаданьне мець яшчэ больш беларускіх групаў, скардзіліся на недахоп мэтадычных распрацовак для беларускамоўных дзетак, што цяжка знайсьці ў продажы беларускія дзіцячыя песьні, музыку для фальклёрных сьвятаў, сцэнары. Таму былі вельмі ўзрадаваныя атрыманым, як па замове, падарункам: касэтам, дыскам, мультфільмам, мэтадычнай літаратуры. Асабліва ўпадабалі кнігу "Скарбонка гульняў", якую выдалі грамадзкія арганізацыі "Чаденя" і "Цэнтар Супольнасьць".



*Тамара Мацкевіч (пятая зьлева) сярод выхавацелек садка № 187.*

Дыплёмамі ТБШ былі ўзнагароджаныя Натальля Анішчук, Ларыса Баброва, Марына Салавей – выхавацелькі ДДУ № 187, Сьвятлана Купрэйчык, Галіна Грыгор'ева, Аксана Шкрэдава, Галіна Кішкурна, Сьвятлана Занімон – выхавацелькі ДДУ №534, а таксама Ірына Юркевіч, загадчыца ДДУ № 202, і выхавацелькі Натальля Рак і Тацьцяна Тарлоўская.

У гімназіі № 9 г. Менску ганараваньне адбылося падчас пэдагагічнай нарады, на якой прысутнічалі ўсе настаўнікі. Дыплёмы атрымалі Марына Янчэўская, Інэса Андруянава, а таксама дырэктар – Ларыса Апалінская, якая пры атрыманьні дыплёму ТБШ пажартавала, што з-за такой ўзнагароды яна можа пазбавіцца працы. Дарэчы, калі-б такі ўплыў мелі ўзнагароды грамадзкіх арганізацыяў на кадравыя рашэньні адукацыйнага кіраўніцтва, то ТБШ-б дакладна не пераводзіла свае дыплёмы на настаўнікаў. Лепш было-б пачаць з таго самага кіраўніцтва, якое прыдумляе непрадухтаваныя рэформы ды ствapae перашкоды для разьвіцця беларускамоўнага навучаньня.

У гімназіі № 4, якой кіруе пераможца конкурсу ТБШ ляўрэат званьня "беларускі настаўнік 2007 году" Юры Бандарэнка, сёлета адзначана пэдагагічная дзейнасьць выкладчыкаў Алены Калтовіч (бел. мова), Уладзімера Дземідовіча (гісторыя), Кацярыны Богдан (пачатковыя клясы), Ірыны Дземідовіч (ангельская мова), а таксама намесьнікаў дырэктара Натальлі Юшкевіч і Галіны Філіпёнак.

Сёлета менскай СШ № 2 нададзены статус гімназіі (№28). Усе клясы тут маюць беларускую мову навучаньня, гімназія спэцыялізуецца на вывучэньні замежных моваў. Вялікая заслуга ў гэтым, безумоўна, былога дырэктара Аляксандра Сядзякі – намесьніка старшыні ТБШ, выдатнага выкладчыка фізыкі, які за свае пэдагагічныя, моваазнаўчыя таленты і грамадзкую працу атрымаў ад ураду Францыі ордэн Акадэмічных пальмаў. ТБШ узнагародзіла выкладчыкаў гімназіі № 28 Тацьцяну Куракевіч (пачатковыя клясы), Вольгу Грышкевіч, Натальлю Штанюк і Натальлю Дабравольскую (беларуская мова).

ТБШ мае намер наведаць яшчэ некалькі дзіцячых садкоў і школаў.

**Алесь ЛОЗКА, Тамара МАЦКЕВІЧ**

Bielarus553C.qxd 2/3/2009 6:31 PM Page 2



# Каляндар “БЕЛАРУСА”

**55 гадоў таму**, 5 лютага 1954 году прэзыдэнт БЦР Радаслаў Астроўскі адхіліў ад пасады кіраўніка Беларускага Вызвольнага Руху ***Людвіга Зарэчнага*** ды прызначыў ***Уладзімера Сеньку***. Пазьней пад патранатам БЦР былі створаны Беларускі Вызвольны Фронт (Дз. Касмовіч).

**40 гадоў таму**, 22 лютага 1969 году, у ***парафіі сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычманд-Гіле*** (Нью-Ёрк) была адслужана першая літургія. Адпраўляў яе а. Сьвятаслаў Коўш. Прыход у Рычманд-Гіле ўтварыўся ў выніку сыходу з бруклінскай аднайменнай парафіі часткі парафіянаў на чале з Кастусём Мерляком. Прычынай быў канфлікт зь япіскапам БАПЦ Васілём (Тамашчыкам). Будынак царквы ў Рычманд-Гіле быў высьвечаны 30 кастрычніка 1983 году. А згаданая вышэй служба адбылася ва ўкраінскай царкве на 139-й вуліцы (Джамайка, Нью-Ёрк).

**35 гадоў таму**, 21 лютага 1974 году, памёр пісьменьнік ***Лявон Савёнак***. Ён, дарэчы, быў ня толькі бліскучым творцам (чаго варты толькі гумарыстычны раман “Дзёньнік Ів. Ів. Чужанінава”), але і чалавекам, што спрычыніўся на эміграцыі да аднаўленьня БАПЦ ды заснаваньня ў 1947 годзе газэты “Бацькаўшчына”, быў нават яе першым рэдактарам. Апроч таго, Л. Савёнак – бацька Зоры Кіпель, знакамітай беларускай дасьледчыцы і бібліёграфа.

**30 гадоў таму**, 11 лютага 1979 году, памёр ***Мікола Гарошка*** – першы старшыня (1949—1952) Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА). Потым ён узначальваў БАЗА ў 1965—1967 гадох, таксама быў першым старшынём Фундацыі імя П. Крэчаўскага.



**20 гадоў таму**, 14 лютага 1989 году, памёр ***Вінцэнт Жук-Грышкевіч***. Да вайны Жук-Грышкевіч быў выкладчыкам у Віленскай беларускай гімназіі і праваслаўнай духоўнай сэмінарыі. А потым настаў 1939 год: арышт і высылка ў Варкуту, затым – Армія генэрала Андэрса: Іран, Палестына, Італія, дзе Жук-Грышкевіч пачаў гуртаваць



вакол сябе маладых жаўнераў. У 1946 годзе фармаваньні польскага корпусу былі пераведзеныя ў Вялікабрытанію. Там В. Жук-Грышкевіч стаў адным з заснавальнікаў – і першым старшынём – Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі.

У 1950 годзе ён пераехаў у Канаду, дзе абараніў дактарат. У 1954—1956 гадох кіраваў беларускай рэдакцый Радыё “Вызваленьне”, потым вярнуўся ў Канаду, пасяліўся з жонкай Раісай у Бэры. У 1970 годзе ўзначаліў Раду БНР. Пахаваны на беларускіх могілках ў Іст-Брансўіку (парафіі ў Гайлэнд-Парку).

Каб была ў Беларусі сэрыя, кшталту “Жыцьцё выдатных людзей”, то дасьледаваньне пра Вінцэнта Жук-Грышкевіча заняло-б у ёй пачэснае месца. Яго ўнёсак у беларускую справу на эміграцыі – велізарны.

**25 гадоў таму**, 25 лютага 1984 году, памёр ***Язэп Пітушка*** (нарадзіўся ў 1913 годзе на Браслаўшчыне). У 1939 годзе



быў арыштаваны і высланы ў Сібір. Потым была армія генэрала Андэрса, штурм Монтэ-Касіна, дзе быў паранены. Я. Пітушка спрычыніўся да заснаваньня ў 1948 годзе Згуртаваньня Беларусаў Канады, а потым з прычыны палітычных разыходжаньняў пакінуў арганізацыю ды заснаваў з аднадумцамі Беларускае Нацыянальнае Аб’яднаньне. Быў кіраўніком Дэлегатуры БЦР на Канаду.

**25 гадоў таму**, 26 лютага 1984 году, у Дэтройце памёр ***Мікола Арцюх (Артон)***. Ён стаяў ля вытокаў Згуртаваньня Беларусаў Вялікабрытаніі, быў яго старшынём у 1956—1957 гадох, вучыўся ў Лювэне, у канцы 1950-х пераехаў у Канаду, далучыўся да ЗБК, а потым перабраўся ў Дэтройт, дзе браў актыўны ўдзел у працы мясцовай суполкі БАЗА ды парафіі БАПЦ сьв. Духу.

**АГ**

*Фоты з архіву Аляксандра Адзінца і Натальлі Гардзіенкі.*

Віншуем беларускую пісьменьніцу і перакладчыцу, майстрыху і фатографа з Таронта **Ірыну Варабей** зь перамогай у фатаконкурсе часапіса “Canadian Geagraphic” (адпаведнік амэрыканскага “National Geographic” у Канадзе).

Фантастычны здымак, які прынёс ёй перамогу, сп-ня Варабей зрабіла восеньскім ранкам з вакна сваёй кватэры, якая знаходзіцца на 22-м паверсе высотнага будынка.

Зычым шаноўнай пераможцы далейшых посьпехаў.






*У сэрыі “Кнігарня “Нашай Нівы” нядаўна выйшла кніга беларускай кухні **“Наша страва”**. Яна мае амаль 500 старонак і мяккую вокладку.*

*Аматары беларускіх стравaў могуць замовіць гэтую кнігу праз рэдакыю “Беларуса”. Замова з дасылкаю авіяпоштаю (5-6 тыдняў) каштуе **$18**, звычайнаю поштаю (10-14 дзён) **$13**. Замовы й аплату дасылайце на адрас рэдакцыі.*

*Паведамляем, што ў амэрыканскім выдавецтве “**Hippocrene Books**” выйшла з друку кніга **Алеся Белага “Belarusian cookbook”**, пра якую мы паведамлялі раней. Яе можна набыць у краме **amazon.com***

Аддзел БАЗА ў Нью-Джэрзі запрашае жадаючых на **вечарыну**, прысьвечаную **дню сьв. Валянціна**, якая будзе **14 лютага** а 7-й вечара ў грамадзкай залі царквы Маці Божай Жыровіцкай па адрасу:

***9 River Rd, Highland Park, NJ 08904***

У праграме песьні й вершы пра каханьне, конкурсы, салодкі стол.

Музычную частку будуць весьці **Валянцін і Тацьцяна Дзямешчыкі**.

У вечарыне возьме ўдзел **Сяржук Сокалаў-Воюш**.

Запрашайце сваіх сяброў. Уступ **$10**, дзецям да 12 гадоў **бясплатна**.

З пытаньнямі тэлефануйце **Але Кузьміцкай**: **(732)617-9774** ці **(908)839-3004**.

**БЕЛАРУС**
*Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце*
**Выдае штомесячна:**
***Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне***
**Сусьветнае сеціва:** ***baza-belarus.org***
**Падпіска $50 на год.**
**Чэкі выпісвайце на** ***BIELARUS***
**BIELARUS**
*Belarusan Newspaper in the Free World*
Published monthly by
***Belarusan American Ass’n, Inc.***
Subscription $50 yearly
Make checks payable to ***BIELARUS***
**Рэдагуе калегія.**
**Адказны рэдактар Марат КЛАКОЦКІ**
**Падпіска Сяргей ТРЫГУБОВІЧ**
**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам ці ініцыяламі, могуць зьмяшчаць погляды, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.**
**Перадрук дазваляецца толькі пры ўмове зазначэньня крыніцы.**
© BIELARUS, 2009
**Адрас для допісаў і кантактаў:**
***BIELARUS***
***P.O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
E-mail:
***hazetabielarus@att.net***
**Сусьветнае сеціва:**
***www.bielarus.org***
ISSN 1054-9455
**Адказнасьць за зьмест рэклямы нясе рэклямадаўца.**

## НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД “БЕЛАРУСА” АХВЯРАВАЛІ:

**Ю. і Л. Кіпель .............250**
**В. Грыцук ...................150**
**Л. Касоўскі ................150**
**У. Набагез .................100**
**У. Ракуць ...................100**
**Г. Руднік ....................100**
**К. Ворт .........................75**
**Ю. Касьцюкевіч ............75**
**І. Ільчук .......................70**
**Р. Качаткоў ..................60**
**Бел.-Амэр.Ц-р у С.-Рывэры. . 50**
**Д. Бубен .......................50**
**Н. Герасімовіч ...............50**
**У. Герасімовіч ...............50**
**В. Грычэнок ..................50**
**С. Дземяшонак ..............50**
**А. Кабяка .....................50**
**І. Камолаў ....................50**
**Н. Карповіч ...................50**
**А. Копат .......................50**
**А. Кузьміч ....................50**
**Е. Маркоўскі .................50**
**А. Мядзьведзік ..............50**
**Ж. Наумчык ..................50**
**Э. Норык .......................50**
**Б. Паук .........................50**
**Л. Пузач ........................50**
**Б. Русак ........................50**
**Л. Семянкова .................50**
**А. Сёмуха ......................50**
**В. Сітнік ........................50**
**А. Хрэноўскі ..................50**
**М. Чупракоў ..................50**
**П. Чурун ........................50**
**Л. Шурак ........................50**
**С. Шырокі ......................50**
**А. Яраховіч ....................50**
**С. Будкевіч ....................40**
**Т. Кузьмянок .................30**
**Г. Няфёдава ...................30**
**В. Заморскі ....................25**
**А. Груша ........................20**
**М. Тарашкевіч ................20**

**Справаздача ад сп-ні**
**М. МАРОЗ з Пэрту, Аўстралія**

**М. Мароз. . . . . . . . .аўстр. дал. 50**
**А. Бразоўскі ..................50**
**Р. Бразоўскі ..................50**
**З. Ёлаб ..........................50**
**В. Лашкевіч ...................50**
**А. Мароз ........................50**
**М. Мігаль ........................50**
**А. Ніжнік ........................50**
**М. Раецкі ........................50**
**Бел. Згурт. Зах.Аўстр. . . . . . . . 28**
**Э. Дамброўскі ................25**

**Усім шчыры дзякуй!**